

Да 915-й гадавіны з першага летапіснага ўпамінання

# Гісторыя Пінска

## Ад старажытнасці да сучаснасці

Нацыянальная акадэмія навук Беларусі. Інстытут гісторыі

*Да 915-й гадавіны з першага летапіснага ўпамінання*

# Гісторыя Пінска

## Ад старажытнасці да сучаснасці

МІНСК
«ВЫШЭЙШАЯ ШКОЛА»
2012

УДК 94(476.7-21Пінск)
ББК 63.3 (4Беи)
Г 51

Аўтары:
А.М. Літвін (кіраўнік аўтарскага калектыву), Ю.М. Бохан, А.М. Вабішчэвіч, І.Ю. Варанкова, Г.Я. Галенчанка, В.Ф. Голубеў, А.І. Груша, В.В. Даніловіч, А.Б. Доўнар, Д.А. Крывашэй, П.Ф. Лысенка, У.В. Ляхоўскі, А.У. Мацук, А.А. Скеп'ян, С.П. Стрэнкоўскі, А.Г. Трубчык, А.Э. Фірыновіч, С.А. Фядзечка, І.Э. Яленская, В.В. Яноўская

Рэдакцыйная калегія:
А.А. Гордзіч, А.А. Канеўскі, А.А. Каваленя, В.В. Даніловіч, Ю.М. Бохан, І.Ю. Варанкова, В.Ф. Голубеў, А.Б. Доўнар, А.М. Літвін (адказны рэдактар), П.Ф. Лысенка, В.В. Яноўская

Рэцэнзенты:
акадэмік НАН Беларусі, доктар гістарычных навук, прафесар М.П. Касцюк;
доктар гістарычных навук, прафесар А.Ф. Вішнеўскі;
кандыдат гістарычных навук, дацэнт М.Г. Жылінскі

Выпуск выдання ажыццёулены пры фінансавай падтрымцы Пінскага гарвыканкама

Г51 **Гісторыя** Пінска. Ад старажытнасці да сучаснасці: да 915-й гадавіны з першага летапіснага ўпамінання / А. М. Літвін [і інш.]. – Мінск : Выш. шк., 2012. – 711 с. : каляр. іл.
ISBN 978-985-06-2139-9.

Упершыню на вялізным дакументальным матэрыяле са шматлікіх айчынных і замежных архіваў даследуецца гістарычнае аблічча горада Пінска ад старажытнага часу да сучаснасці: планіроўка, архітэктура, структура кіравання, паўсядзённае жыццё насельніцтва, перспектывы горада. Прыводзяцца факты, тлумачацца падзеі, якія адбываліся ў рэчаіснасці, паказаны механізм зараджэння г. Пінска, яго станаўлення і развіцця, даецца ацэнка гаспадарча-эканамічнага, сацыяльна-палітычнага і культурнага значэння горада на розных этапах ад старажытнасці да сучаснасці.

Разлічана на гісторыкаў, археолагаў, краязнаўцаў, работнікаў музеяў, выкладчыкаў і студэнтаў, а таксама ўсіх, хто цікавіцца гісторыяй Беларусі, гісторыяй Палесся і яго сталіцы – Пінска.

**УДК 94(476.7-21Пінск)**
**ББК 63.3 (4Беи)**

**ISBN 978-985-06-2139-9**

© Выдавецтва «Вышэйшая школа», 2012

4.4.2. Гарадскія і нацыянальныя асяродкі культуры . . . . . . . . . 330
4.4.3. Рэлігійнае жыццё горада. Канфесійны склад насельніцтва 333

**Раздзел 5. ПІНСК ПАДЧАС ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ**
(*Ляхоўскі У.В., к.г.н., дац.*) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 343

**5.1. Піншчына ў першы перыяд вайны (жнівень 1914 г. – ліпень 1915 г.)** . . . 344

**5.2. У год «вялікага адступлення»** . . . . . . . . . . . . . . . 352

**5.3. Наступствы эвакуацыі і бежанства. Гуманітарныя і культурныя страты** . . . . . . . . . . . . . . . 358

**5.4. На расійскі бок ад лініі фронту (кастрычнік 1915 г. – люты 1917 г.)** . . . 365

**5.5. Палескія дні Аляксандра Блока** . . . . . . . . . . . . . . . 371

**5.6. Падчас кайзераўскай акупацыі 1915–1918 гг.** . . . . . . . . . . 375

**5.7. Культурнае жыццё і адукацыя ў гады Першай сусветнай вайны** . . . . . . 388

**Раздзел 6. ПІНСК У ГАДЫ ПОЛЬСКА-САВЕЦКАЙ ВАЙНЫ**
(*Літвін А.М., д.г.н., праф., Трубчык А.Г., к.г.н.*) . . . . . . . . 397

**6.1. Пачатак вайны** . . . . . . . . . . . . . . . 398

**6.2. Акупацыйны рэжым** . . . . . . . . . . . . . . . 401

**6.3. Ваенныя падзеі 1920 г.** . . . . . . . . . . . . . . . 405

**6.4. С. Булак-Балаховіч у Пінску** . . . . . . . . . . . . . . . 407

**Раздзел 7. ПІНСК У СКЛАДЗЕ ПОЛЬШЧЫ** . . . . . . . . . . . . 413

**7.1. Грамадска-палітычнае жыццё** (*Даніловіч В.В., к.г.н, дац.*) . . . . . . . . . 414

**7.2. Сацыяльна-эканамічнае становішча і духоўна-культурнае жыццё**
(*Вабішчэвіч А.М., д.г.н., праф.*) . . . . . . . . . . . . . . . 429

**Раздзел 8. ПІНСК У ГАДЫ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ І ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВОЙНАЎ** (*Варанкова І.Ю., Літвін А.М., д.г.н., праф., Яленская І.Э., к.г.н., дац.*) . . . . . . . . 457

**8.1. Пінск зноў савецкі** . . . . . . . . . . . . . . . 458

**8.2. Пінск у першыя дні Вялікай Айчыннай вайны (22 чэрвеня – 4 ліпеня 1941 г.)** . . . . . . . . . . . . . . . 467

**8.3. Акупацыйны рэжым** . . . . . . . . . . . . . . . 477

# Раздзел 7
# Пінск у складзе Польшчы



гэтым у заходнебеларускіх ваяводствах, у тым ліку на Піншчыне, інтэлігенцыя і духавенства абыякава адносіліся да ваеннай падрыхтоўкі, а сельская моладзь увогуле не выяўляла жадання займацца ваеннымі практыкаваннямі, да якіх яе ўдавалася прыцягнуць толькі праз арганізацыю спартыўных спаборніцтваў, гульняў і забаў[1]. Аднак, хаця ваенная падрыхтоўка не набыла ўсеагульнага характару, яна змагла ахапіць значную колькасць дапрызыўнай моладзі, у тым ліку і на тэрыторыі Пінска і Пінскага павета[2].


Помнік у гонар 15-годдзя польскай авіяцыі. Малюнак М. Казлоўскага

Летам 1938 г. з нагоды святкавання 15-годдзя польскай авіяцыі па ініцыятыве Таварыства супрацьпаветранай грамадзянскай абароны ў Пінску быў усталяваны своеасаблівы памятны знак у выглядзе металічнай бомбы даўжынёй 2,5 м, які павінен быў перасцерагаць гарачыя галовы ад падрыхтоўкі новай вайны. Трэба адзначыць, што каля Пінска, у Жабчыцах, знаходзіўся ў тыя часы ваенны аэрадром, парк якога складаўся з 15 самалётаў[3].

Грамадска-палітычнае жыццё горада актыўна асвятлялі мясцовыя газеты «Słowo Polesia», «Ziemia wschodnia» на польскай мове і «Пінскае слова», «Пінскі голас», «Пінскае жыццё», якія друкаваліся на ідыш[4].

Такім чынам, грамадска-палітычнае жыццё Пінска і наваколля ў 1921–1939 гг. было складаным і супярэчлівым, але разам з тым цікавым і насычаным падзеямі.

## 7.2. САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАЕ СТАНОВІШЧА І ДУХОЎНА-КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ

У складзе Польскай дзяржавы Пінск быў павятовым горадам. Толькі на працягу некалькіх месяцаў – з лютага па верасень 1921 г. – горад быў цэнтрам Палескага ваяводства. Большасць даследчыкаў лічаць, што катастрафічны ўрон ад пажару 7 жніўня 1921 г., які знішчыў амаль трэць забудовы горада, з'яўляўся асноўнай прычынай пераносу ваяводскага цэнтра ў Брэст. Гарадскія ўлады неаднаразова хадайнічалі адносна пераўтварэння Пінска ў адміністрацыйную сталіцу Палескага ваяводства. Улічваючы патэнцыяльныя магчымасці для развіцця Пінска ў сувязі з пераносам туды з Брэста Палескага ваяводскага ўпраўлення, гарадскі магістрат пагаджаўся ахвяраваць для ўзвядзення адміністрацыйных будынкаў адпаведны зямельны ўчастак. Для гэтага ў бюджэт 1926 г. была закладзена пэўная сума (15 тыс. злотых) для набыцця некалькіх

[1] ДАБВ, ф. 1, воп. 2, спр. 2402, арк. 59.

[2] Тамсама, ф. 67, воп. 2, спр. 1052, арк. 1.

[3] *Курсаў В.* Бомба для Пінска // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Пінска. С. 212.

[4] *Курсаў В.* Пінск у складзе Польшчы // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Пінска. С. 190.

гектараў зямлі[1]. Бурмістр Ч. Мергенталер у жніўні 1927 г. меў размову з палескім ваяводам Я. Крагельскім наконт пераезду Палескага ваяводскага ўпраўлення ў Пінск[2]. У чарговы раз пытанне аб пераносе сядзібы Палескага ваяводства было ўзнята ў гарадской радзе летам 1929 г. у сувязі з чуткамі аб плануемым утварэнні асобнага Падляшскага ваяводства з цэнтрам у Брэсце. Акрамя прэзідэнта Пінска С. Манчынскага ў Варшаву для высвятлення пытання была накіравана асобная камісія гарадской рады[3]. Беспаспяхова ўздымалася гэтае пытанне і пазней. Як сведчыць справаздача пасяджэння гарадской рады ад 21 жніўня 1935 г., вялікія спадзяванні на змену статусу Пінска з павятовага горада на ваяводскі цэнтр ускладалі ўладальнікі прамысловых і гандлёвых прадпрыемстваў. Пад уплывам інфармацыі аб магчымай рэарганізацыі сядзіб ваяводстваў была створана асобная камісія, куды ўвайшлі прэзідэнт горада, 5 радных, прадстаўнікі прамысловасці, гандлю, рамесніцтва, якія павінны былі займацца перамовамі з адпаведнымі ваяводскімі і сталічнымі ўладамі. Фінансаваць гэтую камісію пагадзіліся пінскія купцы[4]. У цэлым, сярод прычын адмаўлення ў пераносе ваяводскага ўпраўлення ў Пінск трэба ўлічваць як матэрыяльныя цяжкасці (адсутнасць адпаведных памяшканняў, неабходнасць іх узвядзення, недахоп фінансавых сродкаў), так і ваенна-стратэгічныя меркаванні (блізкасць да савецка-польскай мяжы), асабліва ў 1930-я гг. У такіх абставінах магістрату немагчыма было дабіцца пералому сітуацыі на сваю карысць. Улічваючы неаднаразовыя адпаведныя захады з боку магістрата і гарадской рады, неапраўданымі з'яўляюцца папрокі ў іх нерашучасці ў гэтым пытанні[5].

Дакументальныя матэрыялы сведчаць, што калі да Першай сусветнай вайны ў Пінску назіралася тэндэнцыя да павелічэння колькасці насельніцтва (1897 г. – 28 тыс. чалавек, 1911 г. – 37,7 тыс. чалавек, 1914 г. – 40 тыс. чалавек), то пасля ваенных падзей лік жыхароў горада рэзка скараціўся (у 1919 г. – толькі 25 тыс. чалавек, у канцы мая 1921 г. – 22,8 тыс. чалавек). Хоць надалей колькасць насельніцтва няўхільна павялічвалася, аднак да верасня 1939 г. даваеннага ўзроўню дасягнуць ужо не ўдалося: у 1939 г. у горадзе было 35,9 тыс. жыхароў[6]. У этнаканфесіянальнай структуры жыхароў горада перавагу мелі яўрэі, адначасова ўзмацняліся пазіцыі палякаў як тытульнай нацыі ў межах Польшчы. Паводле афіцыйных звестак, у снежні 1931 г. у Пінску пражывала 31 927 чалавек, з якіх яўрэі складалі 63,4%, палякі – 22,9, беларусы – 1,8, рускія – 9, «тутэйшыя» – 2,4, іншыя – 0,5%[7].

Статыстычныя матэрыялы дазваляюць высвятліць структуру занятасці насельніцтва Пінска. Па стану на 7 верасня 1930 г. у горадзе налічвалася 704 гандляры, 611 краўцоў, 377 чыноўнікаў, 503 служачыя, 414 купцоў і рамеснікаў, 396 фабрычных і 994 некваліфікаваных рабочых, 449 сталяроў, 263 слесары,

[1] ДАБВ, ф. 2005, воп. 1, спр. 33, арк. 123.
[2] Тамсама, спр. 38, арк. 43 адв.
[3] Тамсама, спр. 48, арк. 85–85 адв.
[4] Тамсама, спр. 71, арк. 141–141 адв., 153.
[5] *Курсов В.* Незавершенный спор // Пинская неделя. 1991. 24 мая. С. 3.
[6] ДАБВ, ф. 2005, воп. 1, спр. 105, арк. 28; спр. 139, арк. 45.
[7] Тамсама, спр. 58, арк. 137.

297 шаўцоў, 139 фурманаў, 73 рамізнікі, 71 цырульнік, 99 маляроў, 86 пекараў, 112 муляроў, 47 кавалёў, 36 інжынераў, 21 адвакат, 18 фатографаў і інш.[1] Яўрэі складалі абсалютную большасць сярод рамеснікаў і значную долю сярод вольных прафесій (урачоў, юрыстаў, настаўнікаў і інш.).

Паступова ішло пашырэнне тэрыторыі горада: з 486 га ў 1922 г. да 1446 га ў пачатку 1930-х гг. Гэта адбывалася рознымі шляхамі. У пачатку 1925 г. да гарадской тэрыторыі былі далучаны частка маёнткаў Альбрэхтаў З. Скірмунта (124 га), Гай Я. Зволінскай (250 га), а таксама ўладанняў езуітаў (50 га). Гарадскія ўлады ў 1925 г. набылі за 8,3 тыс. амерыканскіх долараў Лешчынскі парк з пляцам каля ракі, участкам ракі і выспай, на тэрыторыі якога было 3 дамы і руіны былой фабрыкі. У канцы 1931 г. частка тэрыторыі гмін Пінкавічы і Жабчыцы ўвайшла ў межы горада[2].

Адразу пасля захопу польскімі войскамі заходнебеларускіх зямель там пачалі стварацца польскі адміністрацыйны апарат і адпаведныя органы мясцовага кіравання. Гарадское самакіраванне на тэрыторыі Заходняй Беларусі было прадстаўлена гарадской гмінай, радай і магістратам. У Пінску дзейнічалі толькі рада і магістрат. Рада была распарадчым і кантралюючым органам гарадскога самакіравання. У яе кампетэнцыю ўваходзіла шырокае кола адміністрацыйных і фінансавых пытанняў: фарміраванне апарату кіравання; кантроль дзейнасці магістрата; зацвярджэнне і карэкціроўка гарадскога бюджэту, увядзенне ў яго надзвычайных выдаткаў; набыццё і продаж нерухомай маёмасці; ажыццяўленне пазык і размяшчэнне капіталаўкладанняў; устанаўленне памеру падаткаў, розных збораў; увядзенне тарыфаў для гарадскіх сродкаў камунікацыі; рэгуляванне цэн на тавары першай неабходнасці і інш. У раду ўваходзілі радныя (іх выбірала насельніцтва) і члены магістрата.

У першым складзе рады Пінска ў 1919 г. было 25 радных. Паводле нацыянальнага складу большасць прадстаўлялі яўрэі (16 чалавек). Уваходзілі таксама палякі (6) і рускія (3). Радныя-яўрэі належалі пераважна да Бунда і Паалей-Цыёна. Спачатку рада ў Пінску дзейнічала падчас польскай акупацыі ў красавіку-чэрвені 1920 г. З прыходам савецкай улады ў ліпені 1920 г. рада і магістрат спынілі сваю дзейнасць. Пасля заняцця горада 26 верасня 1920 г. атрадамі С. Булак-Балаховіча і ўваходжання праз 3 дні польскіх войскаў у Пінску зноў пачаў функцыянаваць магістрат.

Перавага ў складзе рады Пінска прадстаўнікоў левых яўрэйскіх партый была адной з асноўных прычын спынення яе дзейнасці 15 кастрычніка 1920 г. Да вясны 1927 г. усе функцыі гарадскога самакіравання выконваў магістрат. Магістрат займаўся выкананнем пастаноў і рашэнняў рады; рэгістрацыяй і распараджэннем нерухомай маёмасцю горада, здачай яе ў арэнду; падрыхтоўкай праектаў гарадскіх бюджэтаў; размеркаваннем падаткаў паводле рашэння рады; кантролем за гарадской камунальнай гаспадаркай; ажыццяўленнем рэгістрацыі прамысловых прадпрыемстваў, рамесніцкіх майстэрняў, гандлёвых устаноў; улікам і рэгістрацыяй насельніцтва; кантролем за санітарна-эпідэміялагічнай сітуацыяй, утрыманнем бальніц, прытулкаў і інш. Супрацоўнікі магістрата наладжвалі забеспячэнне горада харчаваннем, палівам (драўнінай, вугалем) у зімовы перыяд, праводзілі рэгістрацыю ваеннаабавязаных, стваралі камісіі па

---

[1] ДАБВ, ф. 2005, воп. 1, спр. 125, арк. 23.

[2] Тамсама, спр. 33, арк. 2, 91; спр. 58, арк. 106–106 адв.

аказанні дапамогі беспрацоўным і інш. У склад магістрата ўваходзілі бурмістр (яго нярэдка называлі прэзідэнтам горада), які павінен быў ажыццяўляць дзяржаўную палітыку, і лаўнікі. Члены магістрата выбіраліся радай. Бурмістру падпарадкоўваліся ўсе кіраўнікі прадпрыемстваў, якія належалі гораду.

Структура магістрата была наступнай: прэзідыум (бурмістр, яго намеснік, 4 лаўнікі), агульная канцылярыя, аддзелы – фінансава-падатковы, гаспадарчы (бойня, пажарная ахова, бальніца, аптэка, санітарна-гігіенічны кабінет), адміністрацыйны, аддзел запісаў грамадзянскага стану[1]. У штатным складзе магістрата вясной 1923 г. налічвалася 99 чалавек. На ўсе адказныя пасады ў органы гарадскога самакіравання людзей прызначала польская адміністрацыя. У цэлым, магістрат знаходзіўся ў значнай залежнасці ад мясцовай польскай адміністрацыі і павятовага старасты.

Кіраўнікамі магістрата былі толькі палякі. Першым прэзідэнтам пінскага магістрата быў М. Габрылкевіч. Аднак за злоўжыванні з падаткаабкладаннем ён быў зняты з гэтай пасады ў красавіку 1919 г. Пасля яго прэзідэнтам (з лета 1919 г. – бурмістрам) стаў М. Запольскі-Доўнар, яго намеснікам – З. Скірмунт. Сярод першых лаўнікаў магістрата былі М. Паўлоўскі, Я. Слуцкі, С. Кахл (намеснік бурмістра). Потым бурмістрам быў выбраны С. Кахл, яго намеснікамі з'яўляліся М. Паўлоўскі, Б. Барысевіч, лаўнікамі – Я. Слуцкі, А.-О. Файштэйн.

Бурмістрам горада да 7 жніўня 1923 г. з'яўляўся С. Кахл. Намеснікамі бурмістра былі К. Кашэўнік, Б. Барысевіч. У складзе магістрата ў той час былі 4 лаўнікі: Б. Бакштанскі, М. Паўлоўскі, Я. Слуцкі, К. Кашэўнік. У верасні 1924 г. палескі ваявода прызначыў бурмістрам Пінска А. Лянкевіча.

Рашэннем МУС Польшчы ў ліпені 1927 г. Пінск быў выдзелены са складу Пінскага павета ў асобную адміністрацыйную адзінку. 27 сакавіка 1927 г. адбыліся другія (пасля 1919 г.) пры польскіх уладах выбары ў раду Пінска. Выбарчая кампанія суправаджалася вострым саперніцтвам польскіх і яўрэйскіх партый і грамадскіх аб'яднанняў. З 25 выбраных радных большасць была аб'яднана ў 3 палітычныя блокі: сацыялістычны (левіца, 33,3%), яўрэйскі цэнтр (клуб 12-ці, 44,5%), Польскі выбарчы камітэт (польскае кола,15,5%)[2]. Паводле нацыянальнага складу большасць прадстаўлялі яўрэі (16 чалавек), палякаў было 4. Паводле сацыяльна-прафесійнага складу ў раду ўваходзілі настаўнікі, урачы, прадстаўнікі духавенства, купцы, рамеснікі. Яўрэйскі цэнтр разам з левіцай меў большасць ва ўсіх камісіях рады.

Ужо на сваім першым пасяджэнні радныя прынялі рэзалюцыю адносна палітычнай лаяльнасці ў дачыненні да ўлады вышэйшай інстанцыі. Прэзідэнтам горада быў выбраны бурмістр Ч. Мергенталер, буйны ўладальнік нерухомасці і капіталу, яго намеснікам – К. Бакштанскі, лаўнікамі – М. Паўлоўскі, Я. Слуцкі, Т.-Л. Фрайнд[3]. Такім чынам, у магістраце большасць была за палякамі і яўрэямі. Левіца дабівалася ўжо на першых пасяджэннях прыняцця рашэння аб выданні аб'яў магістрата на польскай мове і ідыш, дазволу на выкарыстанне ідыш на пасяджэннях рады[4] (іх падтрымала большасць радных),

[1] ДАБВ, ф. 2005, воп. 1, спр. 28, арк. 22–23, 30–31.

[2] Wybory do Rady Miejskiej w Pińsku // Ziemia Pińska. 1927. № 12. S. 2.

[3] ДАБВ, ф. 2005, воп. 1, спр. 38, арк. 2–4.

[4] Тамсама, арк. 31 адв.

аднак ваяводскія ўлады гэтага не дазволілі, спасылаючыся на тое, што дзяржаўнай мовай з'яўляецца польская.

З-за палітычных супярэчнасцей у радзе часта наладжваліся бурныя дыскусіі, якія нярэдка ішлі з перапынкамі, пасяджэнні праводзіліся вечарам і зацягваліся да позняй ночы. На другім пасяджэнні рады са сваімі палітычнымі дэкларацыямі выступілі прадстаўнікі Бунда, Паалей-Цыёна.

Ч. Мергенталер адмовіўся другі раз быць прэзідэнтам, таму на пасяджэнні рады 4 студзеня 1928 г. замест яго быў выбраны прапанаваны польскімі ўладамі генерал Б. Залескі[1]. Пасля шэрагу захадаў па вынясенні вотуму недаверу намесніку прэзідэнта К. Бакштанскаму той вымушаны быў падаць у адстаўку.

1 снежня 1928 г. гарадская рада выбрала ў склад магістрата новага прэзідэнта – С. Манчынскага (замест генерала Б. Залескага), яго намеснікам быў абраны Л. Брэгман. Лаўнікамі выбралі М. Паўлоўскага, Я. Слуцкага, А.-Ю. Шлякмана. Пасяджэнне гарадской рады набыло такі бурны характар, што для ўціхамірвання радных вымушаны былі выклікаць паліцыю[2].

Нягледзячы на тое што органы гарадскога самакіравання пастаянна бралі крэдыты і пазыкі, іх кіраўнікі не шкадавалі грошай для ўласных інтарэсаў. Так, пасля адстаўкі з пасады прэзідэнта горада генерал Б. Залескі атрымаў шчодрую кампенсацыю і трохмесячны аклад у агульнай суме 3729,97 злотага[3].

Радныя левіцы неаднаразова спрабавалі вынесці вотум недаверу С. Манчынскаму. У адказ на патрабаванне да прэзідэнта горада аб пісьмовых тлумачэннях наконт кампенсацыі для звольненых служачых магістрата правыя радныя пакінулі пасяджэнне рады 22 чэрвеня 1929 г., што прывяло да яго зрыву[4]. Нягледзячы на выбарчыя абяцанні, гарадская рада не задавальняла злабадзённыя патрэбы працоўных, радныя нярэдка імкнуліся выкарыстоўваць гарадскі бюджэт для дасягнення найперш партыйных ці карпаратыўна-ўласніцкіх задач.

У час выбараў прэзідэнта Пінска 27 лістапада 1929 г. яўрэйскія прадстаўнікі пайшлі на паразуменне з польскім колам і падтрымалі іх кандыдата – інжынера С. Хжаноўскага. Прадстаўнік левіцы Р. Арановіч абвінавачваў яўрэйскі цэнтр у бяздзейнасці: не выставілі свайго кандыдата, пагадзіліся, каб кіраўніком быў «чужы чалавек, камісар, прызначаны зверху»[5]. У пачатку 1930 г. быў прадстаўлены новы прэзідэнт горада – падпалкоўнік С. Іардан[6]. Пасля неаднаразовых спроб выбараў прэзідэнта толькі 17 лютага 1931 г. ім стаў былы пасол польскага сейма П. Алевінскі. Лаўнікамі былі выбраны Р. Арановіч, Я. Слуцкі[7].

Пасля таго як выбарчы закон 1933 г. павялічыў узрост выбаршчыкаў, цэнз аседласці і адукацыі, у органы гарадскога самакіравання ўвайшлі пераважна прадстаўнікі заможных слаёў грамадства. На падставе закона «Аб частковых зменах гарадскога статуса ўсходніх ваяводстваў» ад 29 сакавіка 1933 г. магістрат

[1] ДАБВ, ф. 2005, воп. 1, спр. 45, арк. 4.

[2] Тамсама, спр. 48, арк. 1 адв.; спр. 45, арк. 191 адв., 182.

[3] Тамсама, арк. 3.

[4] Тамсама, арк. 46–46 адв.

[5] Тамсама, спр. 50, арк. 82.

[6] Тамсама, спр. 52, арк. 2.

[7] Тамсама, спр. 57, арк. 7–8.

Пінска быў перайменаваны ў гарадское ўпраўленне. У яго структуры да верасня 1939 г. існавалі наступныя аддзелы: агульны, адміністрацыйны, фінансава-гаспадарчы, тэхнічна-будаўнічы, аховы здароўя і сацыяльнага страхавання.

Ідэйна-палітычныя супярэчнасці, карпаратыўныя інтарэсы перашкаджалі эфектыўнай працы рады Пінска. З-за адсутнасці кворуму толькі на працягу 1933 г. быў сарваны цэлы шэраг яе пасяджэнняў – 18 і 23 мая, 14 і 19 чэрвеня[1].

Чарговыя выбары ў раду адбыліся ў 1934 г., калі былі выбраны 32 радныя. Прэзідэнтам горада стаў Е. Алдакоўскі, яго намеснікам – А. Фельсен, лаўнікамі – Е. Дылеўскі, В. Чарноцкі, Е. Басевіч, Е. Плазак. З-за рознагалоссяў так і не ўдалося правесці першае пасяджэнне, дзе меркавалася сфарміраваць камісіі. На выбарах 1934 г. зменшылася доля яўрэяў сярод радных (усяго ў Палескім ваяводстве – да 43%), павялічылася доля палякаў (адпаведна – да 40%)[2]. Падобная тэндэнцыя назіралася ў гарадскіх упраўленнях. Апошнія выбары ў раду Пінска адбыліся ў 1939 г., аднак яны праводзіліся толькі часткова – у некаторых акругах.

Эканамічная палітыка польскіх улад была нацэлена на тое, каб Заходняя Беларусь заставалася сыравінным прыдаткам для цэнтральных і заходніх польскіх ваяводстваў. Палескае ваяводства было адсталым аграрным рэгіёнам. Пасля польска-савецкай вайны і Рыжскага мірнага дагавора 1921 г. ранейшыя рынкі збыту прадукцыі на ўсходзе былі страчаны. Адбывалася драпежніцкае рабаванне прыродных рэсурсаў польскім і замежным капіталам. Не толькі ў цэнтральныя і заходнія рэгіёны Польшчы, але і за мяжу з Пінска вывозілі драўніну, фанеру, запалкі, жывёлу, скуры, рыбу, грыбы і інш.

Працэс аднаўлення разбуранай гарадской гаспадаркі ажыццяўляўся павольна. У выніку пажару 7 жніўня 1921 г. была знішчана цэнтральная частка Пінска. Сярод тысячы пабудоў, якія згарэлі ў агні, было 600 жылых дамоў. Пажар пачаўся раніцай, каля 9 гадзін па невядомай прычыне і за 2–3 гадзіны ахапіў прыкладна чацвёртую частку горада. Аб памеры катастрофы сведчаць наступныя даныя. Згарэлі каталіцкі парафіяльны касцёл, старажытная сінагога, стараства, будынак паліцыі, кінатэатр, 2 аптэкі, 7 аптэчных складоў, 7 гасцініц, 7 цырульняў, 76 рамесніцкіх майстэрань, 244 лаўкі, шмат жылых памяшканняў. Без даху над галавой і месца працы засталіся 10 тыс. жыхароў горада[3]. «Выніку таго пажару яшчэ цяпер адчувае збяднелае насельніцтва, і значная частка жыхароў на сённяшні дзень мае магчымасць для існавання дзякуючы атрыманню сціплай дапамогі ад сваякоў з Амерыкі, – адзначалася ў лісце рады ад 9 верасня 1929 г. на адрас палескага ваяводы. – Нават г.зв. уласнікі нерухомасці ў Пінску ў адрозненне ад іншых жыхароў складаюць незаможнае насельніцтва, бо гэта ў асноўным уладальнікі малых, пераважна драўляных непрыбытковых дамоў, прызначаных толькі для асабістага пражывання»[4]. Пажар ускладніў і без таго няпростую жыллёвую, харчовую, санітарна-эпідэміялагічную сітуацыю, выкліканую разбуральнымі вынікамі Першай сусветнай і польска-савецкай войнаў.

Пасля гэтага пажару паводле рашэння магістрата ў цэнтры Пінска дазвалялася ўзводзіць толькі мураваныя пабудовы. У аднаўленні горада актыўны

[1] ДАБВ, ф. 2005, воп. 1, спр. 65, арк. 42–44.

[2] *Мілеўскі Я.Е.* Нацыянальная структура гарадскіх рад у перыяд з 1919 па 1939 год у Віленскім, Навагрудскім і Палескім ваяводствах // Беларускі гістарычны часопіс. 2000. № 1. С. 22.

[3] ДАБВ, ф. 2001, воп. 1, спр. 24, арк. 56–57.

[4] Тамсама, ф. 2005, воп. 1, спр. 50, арк. 36.

ўдзел прыняў архітэктар і інжынер М. Катовіч, які на працягу 1922–1928 гг. быў аўтарам праектаў шэрагу аб'ектаў: хірургічнай бальніцы Д. Яўсеенкі, атэля М. Шмідта, жылых дамоў Н. Наймана, Е. Айзенберга, В. Медніка, Л. Басевіча на вуліцы Касцюшкі, будынка гімназіі «Тарбут» на вуліцы Завальнай (гарадскім «яўрэйскім Брадвеі»), займаўся аднаўленнем запалкавай фабрыкі Гальперна пасля пажару, перабудовай фанернай фабрыкі братоў Лур'е, пабудовай фанернай фабрыкі Канапацкіх, фабрыкі скур Вайнберга, лесапілак і млыноў[1]. Па стану на верасень 1930 г. з агульнай колькасці будынкаў (6233) жылыя складалі 3585, з іх пасля 1922 г. былі ўзведзены 758. З названых 3585 жылых будынкаў большасць (3061) складалі драўляныя дамы, мураваных было толькі 512.

У першай палове 1920-х гг. мясцовыя жыхары, што вярнуліся з усходу, бежанцы з Савецкай Расіі жылі ў нястачы, паміралі ад голаду і хвароб, не мелі жылля і працы. Частка з іх прад'яўляла гарадскім уладам пасведчанні, якія дазвалялі аднаўляць іх маёмасныя правы, грамадзянскі стан, права на заняцце рамёствамі і інш. Аднак органы мясцовага самакіравання слаба займаліся аднаўленнем прамысловасці. Галоўнай прычынай з'яўляўся недахоп фінансавых сродкаў. У асноўным адраджэнне прамысловасці адбывалася за кошт прыватнай ініцыятывы і прыватнаўласніцкіх сродкаў.

Аднаўленне разбуранай у гады Першай сусветнай вайны фабрыкі клеенай фанеры пачалося з 1922 г. пад кіраўніцтвам А. Лур'е. Пасля яго смерці ўпраўляючым прадпрыемства стаў прадстаўнік гэтага ўплывовага роду Я. Эліасберг. Пры ім фанерная фабрыка ажывіла сваю дзейнасць, была праведзена яе сур'ёзная тэхнічная рэканструкцыя. Значная частка прадукцыі фабрыкі была прызначана для экспарту. Фанера пастаўлялася ў краіны Еўропы, Паўднёвай Амерыкі, Азіі. Попытам карысталася фанера з пакрыццём дуба, ясеню і іншых парод. Пры Я. Эліасбергу быў павышаны да 10% мінімум зарплаты, праведзена добраўпарадкаванне памяшканняў і тэрыторый, вялася барацьба з антысанітарнымі праявамі, была створана для рабочых каса ўзаемадапамогі[2].

Ва ўмовах сусветнага эканамічнага крызісу спынілі сваю дзейнасць многія прадпрыемствы, у тым ліку шклозавод. У 1936 г. у Пінску налічвалася 13 прамысловых прадпрыемстваў (пераважна дрэваапрацоўчай галіны): запалкавая фабрыка «Прагрэс-Вулкан» Гальперна (600 рабочых), фанерная фабрыка Лур'е (600 рабочых), фанерная фабрыка «Лешча», якая належала Х. Фельдману і Б. Кунда (430 рабочых), лесапілкі «Лазго», Любашэўскага, Брацкага, Левана, фабрыка школьнай крэйды, сталярныя і ліцейныя майстэрні, 3 млыны.

З сярэдзіны 1930-х гг. рабіліся беспаспяховыя захады па ажыўленні прамысловасці шляхам стварэння спрыяльнага інвестыцыйнага клімату. У лютым 1936 г. для развіцця шэрагу прамысловых прадпрыемстваў (цагельні, фабрыкі рыбных і мясных кансерваў, фабрыкі мэблі, бровараў і інш.) па просьбе магістрата рада Пінска вырашыла вызваліць новыя прадпрыемствы на працягу 10 гадоў ад гарадскіх і дадатковых дзяржаўных падаткаў[3]. Сярод спрыяльных фактараў для адкрыцця прадпрыемстваў былі выгадныя шляхі зносін (чыгунка, водныя камунікацыі), адсутнасць прамысловасці, наяўнасць сыравіны і таннай

[1] *Ильин А.* Петербургский и пинский архитектор Николай Котович // Гістарычная брама: гісторыя і культура Палесся. Пінск, 2009. № 1 (24). С. 108–109.

[2] *Эліасберг Я.* Успаміны і сустрэчы // Спадчына. 1996. № 4. С. 200–202.

[3] ДАБВ, ф. 2005, воп. 1, спр. 529, арк. 39, 47–48.

рабочай сілы. Аднак водныя шляхі выкарыстоўваліся слаба, вытворчасць мела пераважна кустарны характар, тэхнічная рэканструкцыя тармазілася нізкім узроўнем капіталаўкладанняў.

Электрастанцыя, якая была пабудавана ў 1916 г. у час германскай акупацыі, у пачатку 1922 г. перайшла ва ўласнасць горада. Аднак яна была непрыбытковай, таму гарадскія ўлады вымушаны былі заключыць пагадненні з прыватнымі прамысловымі прадпрыемствамі. У красавіку 1922 г. магістрат Пінска падпісаў дамову з фанерным заводам братоў Лур'е аб часовай перадачы абсталявання электрастанцыі. У жніўні 1923 г. магістрат заключыў пагадненне з Віленскай дырэкцыяй Польскай дзяржаўнай чыгункі. Электрастанцыя была перададзена дырэкцыі ў канцэсію ўзамен на пастаўку электраэнергіі для горада на працягу 20 гадоў. Чыгунка і фанерныя фабрыкі мелі ўласныя электрастанцыі, якія працавалі на драўніне і адходах дрэваапрацоўкі. Аднак асвятленне вуліц горада было нездавальняючым: у 1928–1929 гг. налічвалася 310 электрычных лямпачак магутнасцю 75 і 50 ват. Асвятленне абмяжоўвалася начным часам, не ўсе вуліцы былі асветлены.

У красавіку 1930 г. рада Пінска ўпаўнаважыла магістрат падрыхтаваць дамову з фірмай «Электраінвест» аб будаўніцтве гарадской электрастанцыі. Аднак да верасня 1939 г. кардынальных змен у электрыфікацыі горада не адбылося. Гарадская электрастанцыя мела толькі 2 дызельныя ўстаноўкі магутнасцю 300 і 550 конскіх сіл. Акрамя цывільных польскіх улад уласныя захады па электрыфікацыі рабілі вайскоўцы. З сярэдзіны 1930-х гг. на суднаверфі, якая ажыццяўляла будаўніцтва і рамонт ваенных рачных суднаў, былі ўстаноўлены 30 электрарухавікоў агульнай магутнасцю 208 конскіх сіл, 2 рухавікі ўнутранага згарання[1].

З-за моцных разбурэнняў падчас ваенных падзей гарадская гаспадарка аднаўлялася павольнымі тэмпамі і не магла стаць адразу прыбытковай. Акрамя шматлікіх падаткаў і збораў, якія асабліва балюча закранулі працоўных горада і незаможныя слаі насельніцтва, гарадскія ўлады пастаянна бралі пазыкі ў банкаў, дзяржаўных устаноў, прыватных асоб, за мяжой. З боку дзяржавы падтрымка была нерэгулярнай і слабай. Значная частка выдаткаў накіроўвалася на ўтрыманне адміністрацыі (да 30%). У праекце бюджэту на 1934–1935 гг. з агульнай сумы выдаткаў (648,5 тыс. злотых) толькі 0,5 тыс. злотых былі прызначаны на культуру і мастацтва, 11,9% – на адукацыю, 7% – на ахову здароўя[2].

Гарадскія ўлады рэгулявалі і рэгламентавалі гандаль: выдавалі ліцэнзію для прыватных асоб, выдзялялі плошчы для кірмашоў, рынкаў, крамаў і інш. У маі 1921 г. магістрат прыняў рашэнне, паводле якога былі вызначаны 10 крамаў для рознічнага продажу спіртных напояў, 10 піўных, 8 рэстаранаў. У жніўні 1921 г. былі вызначаны дні для рыначнага гандлю – серада і пятніца, быў забаронены продаж спіртных напояў у нядзелю і святы[3]. Адной з формаў рэгламентацыі гандлю з'яўлялася ўстанаўленне фіксаваных цэн на тавары першай неабходнасці.

Рынак на лодках на беразе Піны, недалёка ад езуіцкага касцёла і калегіума, карыстаўся вялікай папулярнасцю ў мясцовага насельніцтва. Там можна было

---

[1] *Ковалец М.Я.* Энергетика Пинщины в 1921–1939 гг. // Пінскі веснік. 1997. 7 кастрычніка. С. 3.

[2] ДАБВ, ф. 2005, воп. 1, спр. 68, арк. 86–87.

[3] Тамсама, спр. 25, арк. 40; спр. 26, арк. 12.



Кірмаш на беразе Піны



Кірмаш на беразе Піны каля калегіума езуітаў

купіць рыбу, хатніх птушак, прадукты харчавання, ягады (журавіны і інш.), крупы, рыбалоўныя і бытавыя сеткі, дровы, сена і інш. Як правіла, гандаль адбываўся да абеду штодзень, асабліва ў чацвер і пятніцу (перад шабасам у яўрэяў), нядзелю. «На досвітку палешукі – некаторыя па цячэнні, некаторыя супраць цячэння – прыплывалі на сваіх лодках (іх называлі чайкамі) у Пінск. Былі і такія, што прыплывалі напярэдадні вечарам і начавалі[1]. У 1932–1933 гг. за месца на рынку (да 2 кв. м) трэба было плаціць 0,5 злотага, за месца для аднаконкі – 0,3 злотага, параконкі – 0,5 злотага за 1 дзень[2].

Важнае значэнне для развіцця прамысловасці і гандлю, а таксама ваенна-стратэгічнае значэнне мела будаўніцтва ў 1936–1938 гг. шашэйнай дарогі Пінск – Брэст. У 1936 г. з бетону і металічных канструкцый быў узведзены мост праз Піну.

Найбольш рэнтабельным муніцыпальным прадпрыемствам была бойня, дзе аказваліся платныя паслугі па санітарнаму агляду і забою жывёлы. Адной з асноўных крыніц папаўнення гарадскога бюджэту з'яўляліся разнастайныя падаткі і зборы: на ўвоз і вываз тавараў, на продаж білетаў у кінатэатры, на тэатральныя і іншыя відовішчы, на веласіпеды, нерухомасць, рэстараны, шыльды і інш. З 1931 г. польскі ўрад увёў вайсковы падатак. У 1930–1931 гг. на аднаго жыхара Пінска ў сярэднім прыходзілася грамадскіх камунальных падаткаў у суме 20,8 злотага[3]. Арыгінальным быў падатак на сабак: у 1925 г. яго памер складаў 6 злотых у год за аднаго сабаку, за другога – ужо 12 злотых, а за кожнага наступнага – 18 злотых у год[4].

Вынікі сусветнага эканамічнага крызісу 1929–1932 гг. негатыўна адбіліся на матэрыяльным становішчы працоўных, дробных гандляроў і рамеснікаў. У магістрат паступалі сотні заяў з просьбамі аб змяншэнні ці вызваленні ад падаткаў. За перыяд сусветнага эканамічнага крызісу памер непапулярнага сярод рабочых жыллёвага падатку павялічыўся ў 3–6 разоў.

---

[1] *Łuszczyk-Ilienkowa N.* Piński bazar na łódkach // Загароддзе-2: матэрыялы навукова-краязнаўчай канферэнцыі «Палессе – скрыжаванне культур і часу», Пінск, 25–27 верасня 1999 г. Мінск. 2000. С. 164–165.

[2] ДАБВ, ф. 2005, воп. 1, спр. 57, арк. 255 адв.

[3] Тамсама, спр. 500, арк. 2.

[4] Тамсама, спр. 33, арк. 39.


Урачыстае адкрыццё моста праз раку Піну


Помнік у гонар будаўніцтва шашэйнай дарогі Пінск – Кобрын

Для стрымлівання росту цэн ужо ў пачатку 1920-х гг. устанаўліваліся фіксаваныя цэны на прадметы першай неабходнасці. Гэта набыло асабліва актуальна ў час сусветнага эканамічнага крызісу ў канцы 1920-х – пачатку 1930-х гг. Напрыклад, за перыяд з мая 1929 г. па чэрвень 1930 г. цана 1 кг хлеба з жытняй мукі была зменшана з 0,53 да 0,35 злотага[1]. Аднак і такі памер цаны быў непасільным для беспрацоўных, беднякоў.

На гарадское самакіраванне ўскладваліся таксама задачы па добраўпарадкаванні горада: будаўніцтва і рамонт гарадскіх камунікацый, машчэнне і брукаванне вуліц, рамонт і чыстка калодзежаў (у 1930 г. іх налічвалася 36), комінаў, падтрыманне ў належным стане санітарна-эпідэміялагічнай сітуацыі. У красавіку 1922 г. магістрат абавязаў усіх уладальнікаў дамоў зрабіць ці адрамантаваць тратуары насупраць іх будынкаў. У 1923–1924 гг. была забрукавана рынкавая плошча. Аднак большасць вуліц і плошчаў не былі брукаванымі, не мелі тратуараў, што ўскладняла камунікацыю і пагаршала санітарна-эпідэміялагічную сітуацыю. Па стану на 1 студзеня 1930 г. у Пінску з агульнай працягласці вуліц (53 км) былі забрукаваны толькі 17,8 км. Праблематычнымі былі пытанні электрычнасці і асвятлення, водазабеспячэння. Толькі ў 1930-я гг. пачалося будаўніцтва гарадскога водаправода.

Пасля пажару 1921 г. звярталася асаблівая ўвага на строгае выкананне супрацьпажарных мерапрыемстваў (чыстку комінаў і г.д.). Пажары па-ранейшаму прыносілі значны ўрон. Для іх ліквідацыі прыцягваліся розныя цывільныя і вайсковыя структуры. У тушэнні пажару 25 мая 1925 г. прымалі ўдзел не толькі матросы і афіцэры Пінскай рачной флатыліі, але і вучні польскай дзяржаўнай гімназіі, рускай рэальнай школы. Пасля гэтага пажару магістрат абавязаў пінчукоў пакрываць дахі толькі вогнетрывалымі матэрыяламі[2]. У 1926 г. на пажарную ахову было выдзелена 7,3% выдаткаў гарадскога бюджэту.

[1]ДАБВ, ф. 2005, воп. 1, спр. 46, арк. 156; спр. 54, арк. 24 адв., 110 адв.

[2]Тамсама, спр. 33, арк. 92–93.

Восенню 1931 г. магістрат быў упаўнаважаны ўзяць пазыку на 5 гадоў у суме 10 тыс. злотых, каб купіць аўтамабіль-цыстэрну для гарадской пажарнай службы[1]. Для будаўніцтва пажарнага дэпо ў цэнтры горада быў набыты зямельны ўчастак, дзе ўжо стаялі драўляныя пабудовы – дэпо, стайня, вазоўня[2]. Аднак справа з будаўніцтвам пажарнага дэпо рухалася павольна. На пасяджэнні гарадской рады 11 мая 1936 г. прэзідэнт Е. Алдакоўскі адзначаў, што ў распараджэнні пажарнай аховы былі толькі 2 аўтапомпы і 3 аўтацыстэрны. Доступ да пажараў абцяжарвала шчыльнасць гарадской забудовы, што рабіла складаным праезд да асобных месцаў, а таксама адсутнасць водазаборнікаў. Было вырашана павялічыць персанал пажарнай аховы (на 4 чалавекі), выдзеліць дадатковыя сродкі. Было таксама прынята рашэнне аб стварэнні выратавальнай станцыі на рацэ Піна[3].

Востры характар мелі пытанні аховы здароўя, арганізацыі бальніц, санітарнай і ветэрынарнай служб, установ сацыяльнага забеспячэння. Колькасць лячэбна-прафілактычных установ у Пінску была невялікай. У 1919 г. былі адкрыты 2 бальніцы (яўрэйская Каралінская – на 45 месцаў, гарадская ці павятовая – на 50 месцаў), амбулаторыя, аптэка. У канцы 1921 г. магістрат перадаў бальніцы яўрэйскай гміне Пінска. Сам магістрат далей утрымліваў толькі аптэку і амбулаторыю. Акрамя павятовай і яўрэйскай бальніц працавала прыватная хірургічная клініка Д. Яўсеенкі. Асаблівую заклапочанасць выклікалі туберкулёз, розныя інфекцыйныя захворванні. За паспяховую барацьбу з хваробамі, уклад у адкрыццё бальніц, стварэнне медыцынска-санітарнага аддзела магістрата, аптэкі, камплектаванне медыцынскага персаналу званне ганаровых жыхароў Пінска ў жніўні 1922 г. атрымалі гарадскі санітарны ўрач Кавальскі, кіраўнік павятовага шпіталю Д. Яўсеенка, урачы-эпідэміёлагі А. Міхайлаў, А. Фельдман, Зялінскі[4].

Плата за лячэнне абцяжарвала доступ да паслуг бальніц для большасці насельніцтва. За лячэнне ў павятовай бальніцы трэба было плаціць 8–9 злотых за суткі, аперацыя каштавала ад 200 да 300 злотых. Аб дарагоўлі медыцынскіх паслуг сведчаць расцэнкі, якія былі ўстаноўлены ў 1932–1933 гг.: агульная кансультацыя ўрача – 1 злоты, кансультацыя акуліста – 2 злотых, 1 сеанс прагравання кварцавай лямпай – 0,5 злотага. Для прыезджых наведвальнікаў плата павялічвалася ў 2 разы[5]. Нярэдка грамадзяне звярталіся ў магістрат наконт пакрыцця выдаткаў на лячэнне і медыцынскую дапамогу, аднак задавальняліся толькі асобныя просьбы. Бясплатная медыцынская дапамога аказвалася толькі пры інфекцыйных хваробах. Таксама бясплатнымі былі кансультацыі ўрачоў для хворых на туберкулёз, венерычныя хваробы. Матэрыяльна-тэхнічная база ўстаноў аховы здароўя заставалася слабай. Напружанай была сітуацыя і з медыцынскімі кадрамі. Па падліках сучасных польскіх вучоных, на аднаго ўрача ў Палескім ваяводстве прыходзілася 2703 жыхары, савецкія ж даследчыкі лічылі, што ў 2 разы больш[6]. У Пінску сітуацыя была трохі лепшай за кошт

[1]ДАБВ, ф. 2005, воп. 1, спр. 58, арк. 25 адв. – 26.

[2]Тамсама, спр. 50, арк. 3–4.

[3]Тамсама, спр. 74, арк. 179.

[4]Тамсама, спр. 26, арк. 69–69 адв.

[5]Тамсама, спр. 57, арк. 256.

[6]*Абраменко М.Е.* Особенности развития здравоохранения в Западной Беларуси // Веснік Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Я. Купалы. Серыя 1. Гісторыя, філасофія, паліталогія, сацыялогія. 2007. № 1 (47). С. 28.



Атэль «Еўрапейскі»

медыцынскіх работнікаў прыватных (пераважна яўрэйскіх) устаноў: у верасні 1930 г. у горадзе працавалі 34 урачы, 19 дантыстаў, 18 фельчараў, 18 акушэрак, 33 фармацэўты[1].

Пінскі магістрат у першай палове 1920-х гг. утрымліваў хрысціянскі прытулак для старых, дапамагаў дзіцячаму прытулку (яго ўтрымлівала дабрачыннае таварыства), яўрэйскаму прытулку для дзяцей-сірот, прытулку для старых і інш. Для аздараўлення дзяцей польскіх чыноўнікаў і служачых у 1930-я гг. каля чыгункі ў Малоткавічах будаваўся летні лагер.

Сярод спартыўных аб'ектаў у горадзе былі стадыён (адкрыты ў чэрвені 1932 г.), дзе праводзіліся ўсе масавыя спаборніцтвы, спартыўная пляцоўка, якую ўтрымлівала яўрэйская абшчына (зімой ператваралася ў каток), вяслярная база на Піне з пракатам лодак. У 1934 г. пракат маторнай лодкі каштаваў 3 злотых за 1 гадзіну, звычайнай лодкі – 0,6 злотага за 1 гадзіну. Для падтрымкі падарожжаў на веласіпедах праводзіўся іх рамонт.

Аднак стан сацыяльна-культурнай сферы быў крытычным. Яна фінансавалася па астатковаму прынцыпу. Добраўпарадкаванне горада, санітарна-гігіенічныя меры праводзілася пры выкарыстанні жорсткіх адміністрацыйных метадаў.

Гасцініцы і рэстараны з'яўляліся прыватнаўласніцкімі. У 1935 г. у Пінску было 13 атэляў і 5 устаноў з мэбляванымі пакоямі. Самымі дарагімі былі атэлі «Англійскі» (вул. Касцюшкі, 2), «Еўрапейскі» (вул. Гімназічная, 47) – ад 3 да 6 злотых за пакой у суткі. Ад 2 да 3,5 злотага каштаваў пакой у атэлях «Варшаўскі» (вул. Касцюшкі, 35), «Венецыя» (вул. Набярэжная, 62), «Піна» (вул. Агінскага, 1), «Швейцарыя» (Плошча 3 мая, 75). Ад 1,5 да 2 злотых мелі расцэнкі атэлі «Парыж» (вул. Францысканская, 4), «Пінскер» (вул. Школьная, 5), «Зорка» (вул. Завальная, 59), гасцініца Глаўберсона (вул. Броварная, 9). Самымі таннымі (1 злоты ў суткі) былі чыгуначная гасцініца і атэль «Палессе», што знаходзіліся на вуліцы Чыгуначнай[2]. У будынках атэляў размяшчаліся рэстараны і кавярні. У гасцініцах былі душавыя.

[1] ДАБВ, ф. 2005, воп. 1, спр. 125, арк. 23.

[2] *Marczak M.* Przewodnik po Polesiu. Brześć nad Bugiem: Oddział PTK w Brześciu nad Bugiem, 1935. S. 78.

У 1936 г. у горадзе налічвалася 8 рэстаранаў, з якіх вялікай папулярнасцю карысталіся рэстаран і кавярня Грыгаровіча. Да паслуг заможных турыстаў былі бензінавая станцыя, аўтамайстэрні. У адным з лепшых гарадскіх атэляў – «Еўрапейскім» – былі ўласныя гаражы. З-за нешматлікасці аўтамабіляў аснову гарадскога транспарту складаў гужавы. У сярэдзіне 1930-х гг. за праезд па гораду рамізнік браў 0,6 злотага, уначы – 0,75 злотага, за праезд да вакзала – 1 злоты, уначы – 1,25 злотага.

У горадзе былі 2 грамадскія лазні. Гарадскі пляж размяшчаўся на беразе Піны і Струмені, куды можна было дабрацца на пароме.

Нацыянальная палітыка Польшчы была накіравана на ўніфікацыю Палесся з польскімі землямі, нацыянальна-культурную асіміляцыю насельніцтва, ператварэнне яго ў частку польскага этнасу. У Палескім ваяводстве не распрацоўваліся планы па падтрымцы беларусаў, а наадварот, у дачыненні да іх праводзілася гвалтоўная паланізацыя. Палешукі, якія не мелі ў пераважнай большасці сфарміраванай нацыянальнай свядомасці, разглядаліся ў якасці пераходнага тыпу да польскага этнасу.

Нацыянальна-культурны ўціск дапаўняўся сацыяльным прыгнётам. Рабочыя атрымлівалі зарплату, якая была меншай за зарплату рабочых у цэнтральных ваяводствах Польшчы. Яшчэ меншы памер зарплаты мелі жанчыны і дзеці. Змяншалі рэальную зарплату розныя адлічэнні (у тым ліку ў фонд беспрацоўных). Аднадзённая зарплата рабочых фанернай фабрыкі ў Гарадзішчы Пінскага павета ў 1937 г. складала 1,2 злотага, жынчыны атрымлівалі ў 2 разы менш[1]. На прадпрыемствах адсутнічала сацыяльная дапамога па інваліднасці ці хваробе, пенсійнае забеспячэнне па старасці. Пад уздзеяннем сусветнага эканамічнага крызісу павялічыўся ўзровень беспрацоўя. У студзені 1930 г. у горадзе налічвалася больш за тысячу беспрацоўных.

Сацыяльнае і нацыянальнае прыгнечанне выклікала адпаведную рэакцыю супраціўлення і з'яўлялася прыдатнай глебай для актывізацыі барацьбы насельніцтва за нацыянальнае і сацыяльнае вызваленне.

Для зняцця сацыяльнай напружанасці гарадскія ўлады вымушаны былі звярнуць увагу на праблемы беспрацоўных. З мэтай стварэння фонду дапамогі беспрацоўным былі ўведзены даплаты да ўваходных білетаў у кінатэатры і на тэатральныя пастаноўкі. Дадатковы падатак для дапамогі беспрацоўным быў устаноўлены за карыстанне гарадской бойняй, за будаўнічы тэхнічны агляд і інш. Беспрацоўных прыцягвалі да выканання грамадскіх работ (брукаванне вуліц і інш.). Гарадскія ўлады праяўлялі занепакоенасць станам спажывецкага рынку для папярэджання магчымых «галодных бунтаў». У красавіку 1930 г. перад Вялікаднем была выдзелена грашовая дапамога (па 20 злотых) для 34 беспрацоўных, якія ўяўляліся «небяспечным элементам», дзеля прадухілення магчымых «эксцэсаў»[2]. У студзені 1931 г. магістрат даў дазвол на дастаўку ў горад для беспрацоўных 14,5 т жытняй мукі, 18,8 т бульбы, 1,8 т круп, 450 кг тлушчу, 450 кг цукру[3].

Бундаўцы ўжо на першых пасяджэннях рады Пінска ў 1927 г. вылучылі цэлы шэраг злабадзённых задач: барацьба супраць беспрацоўя; жыллёвае, хар-

---

[1] Гісторыя Беларусі: у 6 т. Т. 5. Беларусь у 1917–1945 гг. / А. Вабішчэвіч [і інш.]. Мінск, 2006. С. 359.

[2] ДАБВ, ф. 2005, воп. 1, спр. 54, арк. 42 адв.

[3] Тамсама, спр. 55, арк. 110 адв.



Лесасплаў на Піне

човае, медыцынскае забеспячэнне; увядзенне свецкіх грамадскіх бясплатных школ з роднай мовай навучання; ліквідацыя непісьменнасці, стварэнне сеткі культурна-асветніцкіх устаноў; справядлівая падатковая палітыка; добраўпарадкаванне вуліц рабочых раёнаў; прызнанне права на выкарыстанне ідыш у дзейнасці гарадскога самакіравання; фінансавая падтрымка яўрэйскіх школ і культурна-асветніцкіх арганізацый і інш.[1] Нягледзячы на такую актыўнасць, Бунд фактычна праваліўся на выбарах у гміны і польскі сейм у 1928 г.

Сярод бундаўскіх культурна-асветніцкіх і маладзёжных арганізацый былі аддзелы Цэнтральнай яўрэйскай школьнай арганізацыі (ЦЯША), «Культур-Лігі», рабочага таварыства «Ютжня», маладзёжнага саюза «Цукунфт»[2].

Акрамя бундаўскіх арганізацый у Пінску дзейнічалі сіянісцкія маладзёжныя аб'яднанні «Бейтар», «Фрайгайт». Палесцінская тэматыка была найбольш пашыранай у культурна-асветніцкай працы сіяністаў. Так, аддзел Агульнай сіянісцкай арганізацыі ў Пінску з 1925 г. наладзіў чытанне лекцый «Яўрэі і адраджэнне Палесціны», «Яўрэйская моладзь і аднаўленне Палесціны», «Вёска і горад у Палесціне» і інш.[3] Праводзіліся таксама шматлюдныя мерапрыемствы ў гонар заснавальніка сіянісцкага руху Т. Герцля. Утвораны ў 1925 г. у Пінску філіял Таварыства прыяцеляў Яўрэйскага ўніверсітэта ў Іерусаліме праводзіў

[1] ДАБВ, ф. 2005, воп. 1, спр. 38, арк. 26 адв. – 28.

[2] Тамсама, ф. 1, воп. 9, спр. 1248, арк. 13.

[3] Тамсама, ф. 1, воп. 9, спр. 112, арк. 25.

публічныя лекцыі, збіраў ахвяраванні для гэтай ВНУ[1]. Палесцінская праблематыка нярэдка дапаўнялася міжнароднымі аглядамі жыцця яўрэйскай дыяспары, паведамленнямі па культуралогіі, літаратуры. На некаторыя з публічных лекцый палесцінскай тэматыкі збіралася да 700 слухачоў.

У ліпені–кастрычніку 1928 г. адбыліся выбары ў яўрэйскія рэлігійныя гміны. У выніку выбарчай кампаніі ў Пінску, якая суправаджалася вострай барацьбой паміж рознымі яўрэйскімі палітычнымі партыямі і арганізацыямі, сіяністы атрымалі 35 мандатаў[2].

У міжваенны час Пінск з'яўляўся значным цэнтрам рэлігійнага жыцця. Менавіта там размяшчалася курыя пінскіх біскупаў З. Лазінскага, а затым К. Букрабы. Акрамя рымска-каталіцкай парафіі ў горадзе дзейнічалі абшчына каталіцкага ордэна езуітаў і рымска-каталіцкая семінарыя. Пры дапамозе біскупа З. Лазінскага на тэрыторыі Пінскай рымска-каталіцкай дыяцэзіі да 1932 г. былі адносна спрыяльныя ўмовы для адраджэння ўніяцтва. Горад з'яўляўся адным з цэнтраў місіянерскай дзейнасці неауніі. Там рэгулярна праводзіліся ўніяцкія канферэнцыі – у 1929, 1931, 1933, 1935, 1937 гг.

З 1932 г. пры біскупе К. Букрабе, які праяўляў лаяльныя адносіны да неаўніі, але не аказваў рэальнай падтрымкі, у Пінскай дыяцэзіі пачалася паступовая ліквідацыя існуючых уніяцкіх парафій, спыненне стварэння новых. Для ўніяцкіх святароў было абмежавана ажыццяўленне рэлігійнай практыкі ў адукацыйных установах, патрабавалася выкарыстанне польскай мовы. Пры К. Букрабе рэктарам Пінскай рымска-каталіцкай семінарыі быў біскуп К. Няміра, з 1935 г. – ксёндз А. Петрані. Шмат зрабіў для добраўпарадкавання навучальных карпусоў, умацавання гаспадаркі семінарыі ксёндз Л. Хвецька. Сярод выкладчыкаў семінарыі былі ксяндзы В. Гебартоўскі, З. Каленюк, К. Контак, Ю. Казлоўскі і інш.[3]

Разам з рымска-каталіцкай парафіяй даволі прадстаўнічым па колькасці з'яўляўся праваслаўны прыход у Пінску, які быў цэнтрам Палескай праваслаўнай епархіі. У горадзе функцыянавала Палеская праваслаўная кансісторыя. У канцы 1922 г. кіраўніком Палескай праваслаўнай епархіі быў прызначаны епіскап Аляксандр (М. Іназемцаў), выпускнік Пецярбургскай духоўнай акадэміі, да якога духавенства і веруючыя адносіліся неадназначна. Многія лічылі яго стаўленікам польскіх улад, які прытрымліваўся прадзяржаўнай пазіцыі, а таксама падтрымаў у 1924 г. увядзенне грыгарыянскага календара.

Ва ўмовах пашырэння паланізацыі праваслаўныя дзеячы імкнуліся захоўваць уласныя духоўныя каштоўнасці. У 1929 г. Палескі епархіяльны місіянерскі камітэт выдаў у Пінску зборнік царкоўных спеваў у трох частках – «Обиход нотного церковного пения»[4], у складанні якога прымалі ўдзел некалькі груп знаўцаў царкоўных спеваў[5]. Такое выданне было запатрабаваным, бо гэтага дамагаліся павятовыя і епархіяльныя місіянерскія канферэнцыі, курсы для

---

[1] ДАБВ, спр. 442, арк. 2–4; спр. 1007, арк. 13–14, 24, 31, 35, 35 адв.

[2] *Jaworski W.* Struktura i wpływy syjonistycznych organizacji politycznych w Polsce w latach 1918–1939. Warszawa, 1996. S. 83.

[3] *Petrani A.* Ks. Kaziimierz Bukraba Biskup Ordynariusz Piński (1885–1946) // Nasza Przeszłość. 1968. T. 28. S. 225–227.

[4] Обиход нотного церковного пения. Пинск, 1929. Ч. 1–3.

[5] *Щавинская Л.* Пинский «церковный обиход» 1929 г. // Загароддзе-3: матэрыялы навукова-краязнаўчай канферэнцыі «Палессе ў XX стагоддзі», Беласток, 1–4 чэрвеня 2000 г. Мінск, 2001. С. 97.

псаломшчыкаў і рэгентаў царкоўных хораў. У складанні і рэдагаванні зборніка пад кіраўніцтвам епіскапа Аляксандра ўдзельнічалі члены Пінскай духоўнай кансісторыі, сакратары, члены епархіяльнага місіянерскага камітэта. Магчыма, што з нататкамі па тэорыі спеваў у пачатку выдання выступіў рэгент Пінскага кафедральнага сабора Д. Куліш. Першая частка ўтрымлівала каля 300 песнапенняў, другая – каля 200, трэцяя – больш за 60 (на мясцовых дыялектах, рускай, украінскай, польскай, царкоўнаславянскай мовах).

Рэлігійныя святы карысталіся вялікай пашанай праваслаўных вернікаў. «На Усяночную хадзіў мой бацька і брат. У царкве было вельмі многа людзей. Вакол вешалі гірлянды рознакаляровых лямпачак, каб было светла ў час хрэснага ходу. Служба праводзілася на рускай мове (маецца на ўвазе царкоўнаславянская. – *А.В.*). Бацька мне гаварыў, што быў уціск з боку ўлад, каб казанні былі па-польску, аднак нашы папы не валодалі дастаткова добра польскай мовай і бацюшка Пётр Каліноўскі важным голасам рабіў казанне па-руску. І толькі калі былі госці з Варшавы, то казанне прыгожа па-польску гаварыў благачынны, настаўнік рэлігіі ў дзяржаўнай гімназіі Канстанцін Комар»[1].

Для заходнебеларускага насельніцтва ў складзе Польшчы злабадзённай праблемай заставалася непісьменнасць. У Пінску ў 1930 г. 28,89% яго жыхароў з'яўляліся непісьменнымі. Беларусы, яўрэі, рускія былі пазбаўлены магчымасці мець дзяржаўныя нацыянальныя школы. Сістэма адукацыі, якая стваралася польскімі ўладамі, была нацэлена на правядзенне паланізацыі мясцовага насельніцтва. Па стану на 10 ліпеня 1927 г. у горадзе дзейнічалі 3 гімназіі: 1) дзяржаўная польская гімназія імя Ю. Пілсудскага, якая з'яўлялася змешанай установай, дзе вучыліся асобна хлопцы і дзяўчаты. У 1936 г. у выкладчыцкім складзе гімназіі налічвалася 27 настаўнікаў, а вучнёўскі кантынгент складаў 383 чалавекі (паводле афіцыйных крыніц, сярод іх палякаў было 140, рускіх – 102, яўрэяў – 78). Плата за вучобу была высокой – каля 150 злотых у год; 2) прыватная яўрэйская жаночая гімназія з польскай мовай выкладання, якая была заснавана ў 1915 г. і належала А. Чэчык-Голінкер. Паколькі там была больш высокая плата за вучобу, яе маглі наведваць толькі дзеці з заможных сем'яў. Гімназія мела матэматычна-прыродазнаўчы профіль; 3) прыватная яўрэйская гімназія таварыства «Тарбут». Акрамя таго, функцыянавалі 5 дзяржаўных польскіх пачатковых школ, школа рамёстваў Польскай мацежы школьнай, 7 прыватных яўрэйскіх пачатковых школ, 2 яўрэйскія вучылішчы – рамесніцкае і гандлёвае[2]. У 1936 г. Польска мацеж школьна ўтрымлівала ў Пінскім павеце 8 пачатковых школ (356 вучняў), у Пінску – школу рамёстваў і прафесійную жаночую школу (171 навучэнец)[3].

Органы гарадскога самакіравання выдаткоўвалі сродкі на ўтрыманне пачатковых школ (інвентар, паліва, электрычнасць), выдзялялі жыллё для настаўнікаў, выдавалі ім матэрыяльную дапамогу, выплачвалі стыпендыю некаторым вучням і інш. У сярэдзіне 1930-х гг. быў набыты зямельны ўчастак каля гарадскога парка для будаўніцтва 7-класнай пачатковай школы.

---

[1] *Łuszczyk-Ilienkowa N.* Prawosławne święta w przedwojennym Pińsku // Загароддзе-3: матэрыялы навукова-краязнаўчай канферэнцыі «Палессе ў XX стагоддзі», Беласток, 1–4 чэрвеня 2000 г. С. 102.

[2] ДАБВ, ф. 2005, воп. 1, спр. 125, арк. 24.

[3] Sprawozdanie z działalności Towarzystwa Polskiej Macierzy Szkolnej w 1936 roku // Polska Macierz Szkolna. 1937. № 2. S. 14–20.



Запалкавая фабрыка

Культурнае жыццё горада мела прыкметы правінцыйнасці. У міжваенны час у Пінску не быў створаны стацыянарны тэатр. Аматарскі перасоўны тэатр «Перадавік» з Брэста беспаспяхова спрабаваў набыць пастаянную сцэнічную пляцоўку ў Пінску[1]. Прадпрымальныя браты Гольцманы здолелі стварыць часовы, сезонны тэатр, імкнуліся запрашаць вядомыя мастацкія калектывы. У горадзе гастралявалі шматлікія тэатральныя трупы, сярод іх віленскі тэатр «Рэдут», які паказваў «Вяселле» С. Выспянскага, «Снег» С. Пшыбышэўскага, «Сястра Беатрыс» М. Матэрнінка і інш. З трох музычных школ на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1920–1930-я гг. адна знаходзілася ў Пінску – школа імя Г. Вяняўскага. У канцы 1928 г. – пачатку 1929 г. прапаноўвалася больш актыўна выкарыстоўваць для музычнай дзейнасці Г. Молаха, былога прафесара Варшаўскай кансерваторыі, вядомага піяніста і кампазітара, які па сямейных абставінах пастаянна пражываў ў Пінску[2]. У горадзе таксама дзейнічалі 2 кінатэатры – «Казіно» (на 320 месцаў) і ў чыгуначным клубе (190 месцаў).

Фонды ўсіх 34 бібліятэк горада налічвалі 92 914 экзэмпляраў. Асабліва вылучаліся фонды бібліятэкі Пінскай рымска-каталіцкай семінарыі, дзе было 42,3 тыс. кніг (1939)[3]. Сярод іх – 4 тыс. старадрукаў, больш за 600 рукапісаў XVII–XIX стст. У бібліятэку трапілі ўласныя кнігазборы біскупа З. Лазінскага, ксяндза В. Гебартоўскага, рэлігійная літаратура, перададзеная мітрапалітам А. Шаптыцкім, і інш. Упарадкаваннем кніжных фондаў займаўся ксёндз К. Контак. У 1940 г. 33 тыс. кніг гэтай бібліятэкі былі вывезены ў Цэнтральны антырэлігійны музей у Маскве[4].

---

[1] ДАБВ, ф. 1, воп. 8, спр. 298, арк. 12, 36, 47, 50; спр. 299, арк. 26–28.

[2] Тамсама, воп. 11, спр. 476, арк. 27–31.

[3] *Borowski E.* Wyższe Seminarium Duchowne Diecezji Pińskiej 1925–1939. Drohiczyn, 2000. 211 s.; *Petrani A.* Ks. Kazimierz Bukraba Biskup Ordynariusz Piński (1885–1946) // Nasza Przeszłość. 1968. T. 28. S. 227.

[4] *Вабішчэвіч А.М.* Праблемы нацыянальна-культурнага жыцця заходніх абласцей БССР у 1939–1941 гг. // Białoruskie zeszyty historyczne. Białystok, 2000. № 13. S. 128–129; *Вабішчэвіч А.* Так вырашаўся ў 1940 г. лёс бібліятэкі Пінскай семінарыі // Кантакты і дыялогі. 2000. № 3. С. 8–11; *Вабішчэвіч А.* «Примите самые решительные меры к недопущению вывоза указанных культурных ценностей...»: аб лёсе гісторыка-культурнай спадчыны ў Заходняй Беларусі ў 1939–1941 гадах // Голас Радзімы. 2000. 30 жніўня. С. 6.

Пад уплывам ідэй польскага рэгіяналізму актывізаваўся краязнаўчы рух. Самастойнае краязнаўчае таварыства ў Пінску ўзнікла восенню 1924 г. па ініцыятыве пінскага старасты С. Тамашэвіча. На працягу 1924–1926 гг. праводзіўся збор матэрыялаў для музея, асобныя артэфакты культуры для якога ахвяравалі польскія чыноўнікі, землеўладальнікі, мясцовая інтэлігенцыя. Напрыклад, М. Бутрымовіч падаравала іконы і іншыя каштоўныя мастацкія творы XVIII–XIX стст., П. Алевінскі перадаў некалькі прадметаў зброі XVII–XIX стст., Р. Гарашкевіч – каштоўныя архіўныя матэрыялы, выданні. Восенню 1926 г. на чале ўправы краязнаўчага таварыства ў Пінску стаў галава горада Ч. Мергенталер, які аказваў таварыству фінансавую падтрымку. Краязнаўчае таварыства ў Пінску ў красавіку 1927 г. стала аддзелам Польскага краязнаўчага таварыства[1], якое праводзіла сустрэчы пад назвай «Краязнаўчая чорная кава», наладжвала дыскусіі, лекцыі, выступленні мастацкіх калектываў, кінасеансы. Значны ўклад у адкрыццё музея ў Пінску ў 1926 г. унеслі Д. Геаргіеўскі, Р. Гарашкевіч, Ю. Абухоўскі і іншыя дзеячы.

Ураджэнец Цярнопальшчыны Р. Гарашкевіч апынуўся на Палессі пасля заканчэння ў 1925 г. Львоўскага ўніверсітэта, дзе вывучаў археалогію, геральдыку і гісторыю мастацтваў. У археалагічным кабінеце музея імя Дзедушыцкіх у Львове ён вывучаў музейную справу. Спачатку Р. Гарашкевіч выкладаў гісторыю ў гімназіі ў Лунінцы, а потым заняўся стварэннем краязнаўчага музея ў Пінску. Паводле яго меркаванняў, менавіта гэты горад «дзякуючы свайму цэнтральнаму геаграфічнаму становішчу і гістарычным традыцыям павінен быць сталіцай навукова-культурнага руху Палескага краю»[2]. Р. Гарашкевіч быў прыхільнікам папулярнай тады ідэі польскага рэгіяналізму. Яго выбралі кіраўніком музейнай камісіі Палескага краязнаўчага таварыства.

Р. Гарашкевіч надаваў вялікае значэнне разгортванню культурна-асветніцкай і краязнаўчай працы сярод школьнікаў, стварэнню перыядычнага навуковага выдання па праблемах Палесся. Яму даводзілася рэдагаваць краязнаўчы альманах «Ziemia Pińska». Р. Гарашкевічу належыць аўтарства кніг і брашур «Пінск і яго ваколіцы» (1926), «Традыцыі Пінскай зямлі» (1928), «Гістарычныя нататкі аб некаторых мясцовасцях Пінскага павета» (1928), «Столінскі павет (гістарычныя нататкі)» (1930). У яго працах «Засцянковая шляхта на ўсходніх землях» (1936) і «Спіс родаў засцянковай шляхты Пінскай зямлі» (1937) прааналізавана гісторыя мясцовых шляхецкіх родаў, відазмяненне іх прозвішчаў, геральдыка, лёс некаторых населеных пунктаў.

Гонар музея ў Пінску складаў этнаграфічны аддзел, дзе былі прадстаўлены калекцыі керамікі з Гарадной, Пружан, Пагост-Загародскага і іншых ганчарных цэнтраў, вырабы з лазы, бяросты, саломы, калекцыі народных палескіх strояў, тканін і інш. Даволі вялікім быў збор фотаздымкаў Д. Геаргіеўскага[3]. У ходзе дыскусіі па бюджэту на адным з пасяджэнняў гарадской рады ў верасні 1927 г. прапаноўвалася выдзеліць субсідыі для адукацыйных устаноў, прызначыць для вучняў стыпендыю імя М. Бутрымовіча, аказваць матэрыяльную падтрымку Палескаму музею для выдання манаграфічных прац пра Пінск і кансервацыі муроў замка Вішнявецкіх[4].

---

[1] *Цітовіч І.У.* Дзейнасць Польскага краязнаўчага таварыства на тэрыторыі Палескага ваяводства (1921–1939 гг.) // Веснік Брэсцкага ўніверсітэта. 2003. № 2. С. 74.

[2] ДАБВ, ф. 1, воп. 2, спр. 19, арк. 74.

[3] *Лабачэўская В.* Захавальнік Палескага музея Дзмітрый Георгіеўскі. Мінск, 2001. С. 36–38.

[4] ДАБВ, ф. 2005, воп. 1, спр. 38, арк. 83.



Фрагмент выставачнай залы Палескага музея

Музей дэманстраваў свае экспанаты на і Усеагульнай краёвай выстаўцы ў Познані (1929), выстаўцы народнага мастацтва ў Варшаве (1930), этнаграфічнай выстаўцы ў Кракаве (1931).

У 1936 г. Міністэрства веравызнанняў і грамадскай асветы перадало ў Палескі музей у Пінску калекцыю – больш за 100 этнаграфічных прадметаў з Палесся, якія збіраліся раней Я. Крагельскай, жонкай палескага ваяводы Я. Крагельскага. Гэта калекцыя захоўвалася ў Нацыянальным музеі ў Варшаве. Перад вайной планавалася перадаць у музей калекцыю Палескага таварыства народных промыслаў, што захоўвалася на дэпазіце ў Этнаграфічным музеі Віленскага ўніверсітэта імя С. Баторыя[1], аднак яна была вернута ў Мінск толькі ў 1977 г.

Спачатку музей размяшчаўся ў будынку на вул. Касцюшкі, 9, у двух пакоях, потым пераехаў у новае памяшканне на вул. Агінскага. У выдзеленым гарадской радай будынку на вул. Касцюшкі, 27, быў зроблены рамонт і 5 красавіка 1936 г. урачыста адкрыта новая экспазіцыя. Яе мастацкае афармленне ажыццяўляў мастак Ф. Лаўроў, выпускнік Кракаўскай мастацкай акадэміі. Захады па будаўніцтву ўласнага будынка музея былі спынены Другой сусветнай вайной. Да 1939 г. у фондах музея налічвалася 7,2 тыс. адзінак, а ў сярэдзіне 1941 г. – звыш 11 тыс. адзінак аб прыродзе, побыце, гісторыі і культуры Заходняга Палесся[2].

Акрамя музейнай справы ў дзейнасці Краязнаўчага таварыства ў Пінску важнае значэнне надавалася навукова-асветніцкай, папулярызатарскай дзейнасці. Краязнаўчы гурток вучняў дзяржаўнай гімназіі ў Пінску выдаў цэлы шэраг брашур. Сярод іх – «З краіны ўюноў» (1935), дзе апісваюцца сямейныя абрады (вяселле), каляндарныя аграрныя абрадавыя традыцыі, звязаныя з ворывам, сяўбой, жнівом і інш. У выданні «Некалькі слоў аб Пінску, таксама святы, абрады і вераванні палескага люду» (1936) апісаны каляндарныя святы і абрады – калядныя, на Вербніцу, Вялікдзень і іншыя, прыведзены тэксты святочных песняў. У брашуры гуртка «Кабета на Палессі» (1939) адлюстраваны хатнія заняткі, прылады працы, прыведзена апісанне палескага вяселля, змешчаны фотаздымкі, тэксты вясельных песень і г.д.

Археалагічнымі даследаваннямі займалася Дырэкцыя дзяржаўных калекцый у Варшаве. У 1934 г. у час раскопак у Пінску былі выяўлены рэшткі сцен, каналаў, падземныя хады замка князёў Вішнявецкіх.

---

[1] *Лабачэўская В.А.* Лёс дзвюх палескіх калекцый 1920–1930-х гадоў // Гісторыка-культурная спадчына Брэсцка-Пінскага Палесся: паміж мінулым і будучыняй (да 450-годдзя г. Століна): зб. матэрыялаў Міжнароднай навуковай канферэнцыі, Столін, 28–29 верасня 2005 г. Ч. 1. Брэст, 2006. С. 166–167, 169.

[2] *Гужалоўскі А.А.* Музеі Беларусі (1918–1941 гг.). Мінск, 2002. С. 133.


Удзельнікі ўрачыстага адкрыцця III Палескага кірмашу

Асаблівую папулярнасць у другой палове 1930-х гг. набылі Палескія кірмашы. Ініцыятарам іх правядзення выступіў аддзел турызму Палескага ваяводскага ўпраўлення. У канцы красавіка 1935 г. у Пінску адбыўся сход ініцыятыўнай групы адносна арганізацыі Палескага кірмашу[1]. Улічваліся і гістарычныя традыцыі кірмашоў у папярэдні час. Летам 1935 г. у Пінску адбылося «Свята Палесся», якое ўключала выставу мясцовай сыравіны, прамысловых тавараў і рамесніцкіх вырабаў. Дэманстравалася таксама прадукцыя палескіх мастацкіх промыслаў.

З 15 жніўня па 3 верасня 1936 г. у Пінску праходзіў І Палескі кірмаш. Мерапрыемствы адбываліся ў Лешчынскім парку, дзе былі пабудаваны 2 драўляныя выставачныя павільёны, якія былі аздоблены фанерай пад мураваныя. Падтрымку аказвалі гарадскія і ваяводскія ўлады. Быў выдадзены гід па Палескім кірмашы і «Інфарматар горада Пінска».

На кірмашы сярод 55 экспанатаў рамесніцкага аддзела былі рымарскія вырабы, кніжныя пераплёты, чамаданы, сталярныя і такарныя вырабы, мэбля, гадзіннікі, музычныя інструменты, прадукцыя гарбароў, краўцоў, кавалёў, ручнікі, жаночыя гарсеты, бялізна, кандытарскія вырабы, вітражы і інш.

Геаграфія вытворцаў была пакуль невялікай – пераважалі рамеснікі з Пінска і Брэста. Бронзавымі медалямі былі адзначаны высокамастацкія творы Я. Жукоўскага і П. Петразаводскага. Прамысловы аддзел быў прадстаўлены клеенай фанерай і запалкамі. Сярэбраны медаль атрымала фанерная фабрыка братоў Лур’е, бронзавы – фабрыка «Union» (Гарадзішча Пінскага павета). У аддзеле народных промыслаў былі ў асноўным тканіны, якія дэманстравалі гурткі вясковых гаспадынь з Брэста, Пінска, Лунінца, Століна, Косава, Пружанаў, Кобрына, рынак народных промыслаў (Брэст) і жаночыя сельскагаспадарчыя школы Дубіцы і Плянты Брэсцкага павета. У аддзеле мастацтва экспаніравалася 104 творы[2]. Сярэбраны медаль атрымаў мастак І. Дыміч, які прадстаўляў пейзажы і партрэты. Асаблівай папулярнасцю карысталіся яго пейзажныя карціны «Палескія сенажаці», «Рыбацкая хата каля Пінска». Бронзавым медалём быў узнагароджаны мастак і скульптар Ф. Лаўроў, які ўдзельнічаў у афармленні павільёнаў кірмашу. Скульптурную кампазіцыю «Паляшук», якая стала сімвалам Палескага кірмашу, спачатку выканаў з дрэва П. Петразаводскі, а потым ужо зрабіў яе з бетону менавіта Ф. Лаўроў[3]. Залатым медалём была адзначана скульптар з Кобрына Світыч-Відацкая.

[1] *Melech E.* Skąd wziął Jarmark Poleski? // Dni Polesia. Pińsk, 1939. S. 4.

[2] ДАБВ, ф. 2005, воп. 1, спр. 529, арк. 11–18; Pierwszy Jarmark Poleski w Polsce odrodzonej. Brześć nad Bugiem, 1937. S. 6, 9.

[3] *Ильин А.* Русские под небом Полесья // Братина. Вып. 4 (12). М., 2008. С. 220.

У ходзе правядзення кірмашу быў наладжаны цэлы шэраг мерапрыемстваў: велагонка, футбольныя матчы з удзелам каманды «Пагоня» (Львоў), рэгаты на возеры каля вёскі Гарадзішча, рэгіянальныя дажынкі, народныя забавы[1]. Правядзенне Палескага кірмашу актывізавала краязнаўча-турыстычны рух на Палессі.

На II Палескім кірмашы, які праходзіў з 22 жніўня да 5 верасня 1937 г., колькасць павільёнаў павялічылася. Яны прадстаўлялі мясцовую прамысловасць, сельскую гаспадарку, рамёствы, гандаль, адукацыю, хату рыбака, меліярацыю, ветраны рухавік помпавай станцыі. Шырокі асартымент твораў ткацтва, пляцення, ганчарства, гарбарства і іншых рамёстваў і промыслаў паказалі мясцовыя майстры[2]. Таксама дэманстраваліся фальклорна-этнаграфічныя кампазіцыі – пра палескае вяселле, провады нявесты, свята Дажынкі. Былі наладжаны выступленні хору Пінскай дзяржаўнай гімназіі, аматарскага аркестра, вясковых і школьных харавых калектываў. У рамках урачыстасцей была паказана інсцэніроўка абраду палескага вяселля ў выкананні гуртkoў вясковых гаспадынь Косаўскага павета. Фотамайстар Ю. Шыманчык быў узнагароджаны ганаровым дыпломам II Палескага кірмашу. Акрамя яго твораў дэманстраваліся фотапаштоўкі Д. Георгіеўскага, С. Хамянтоўскай і іншых фотамайстроў. Экспанаваліся творы мастакоў з Пінска Я. Пулхава, Ф. Лаўрова, А. Лазіцкага. Палескі музей набываў лепшыя творы ці атрымліваў іх ад дырэкцыі Палескага кірмашу (сярод іх была калекцыя чапцоў)[3].

На III Палескім кірмашы ў Пінску (15 жніўня – 4 верасня 1938 г.) акрамя ўжо традыцыйных аддзелаў (прамыслова-гандлёвага, рамесніцкага, сельскагаспадарчага, народных промыслаў) вялікую цікавасць выклікалі паляўнічы і рыбацкі аддзелы. Паляўнічы аддзел быў арганізаваны спецыяльным камітэтам. Яго экспанаты, якія прыслалі кіраўнік Давыд-Гарадоцкай ардынацыі К. Радзівіл, а таксама К. Пуслоўскі, Р. Скірмунт і іншыя буйныя землеўладальнікі, былі размешчаны ў спецыяльным павільёне, што вылучаўся высокім узроўнем афармлення. Для наведвальнікаў наладзілі прэзентацыю паляўнічых сабак. Рыбацкі аддзел быў створаны Палескім рыбацкім кааператывам і гуртком рыбакоў у Пінску. Аддзел мерапрыемстваў запрасіў для выступленняў самадзейныя мастацкія калектывы Пінскага, Косаўскага, Лунінецкага, Столінскага паветаў[4]. Паводле ўспамінаў уладальніка маёнтка Мунтвіца Пінскага павета Г. Тукальскага-Нелюбовіча, арганізатары кірмашу стараліся надаць экспазіцыям фальклорна-этнаграфічны характар. «Добра было прадстаўлена ганчарства з вёскі Гарадная. Шматлікімі былі вырабы мясцовых калёснікаў... Хапала і вядомых непранікальных ботаў з Давыд-Гарадка, якімі цікавіліся рыбакі ... у рыбацкім куране выдавалася юшка»[5].

Нягледзячы на вялікую цікавасць да кірмашу з боку мясцовай грамадскасці, зрабіць яго прыбытковым не ўдалося. Не былі выкананы прагнозныя па-

---

[1] Jarmark Poleski // Słowo Polesia. 1936. 26 sierpnia. S. 1.

[2] Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Пінска. С. 215.

[3] *Лабачэўская В.* Палескія кірмашы ў Пінску (1936–1939 гады) // Загароддзе-2: матэрыялы навукова-краязнаўчай канферэнцыі «Палессе – скрыжаванне культур і часу», Пінск, 25–27 верасня 1999 г. С. 48.

[4] ДАБВ, ф. 2005, воп. 1, спр. 529, арк. 46 адв., 47.

[5] Воспоминания о «Полесских ярмарках» // Гістарычная брама: гісторыя і культура Палесся. 2009. № 1(24). С. 52.



Вялікая сінагога ў Пінску

казчыкі даходаў за арэнду стэндаў, прылаўкаў. Дэфіцыт бюджэту III Палескага кірмашу склаў 24039,2 злотага (45,8% ад усіх выдаткаў), што было выклікана затратамі на будаўніцтва новых павільёнаў і рамонт старых, іншымі прычынамі[1]. У выйгрышы была толькі Ліга падтрымкі турызму, якая выдала і распаўсюджвала карты, краязнаўчую літаратуру. У час кірмашу турыстам прапаноўвалі наведаць францысканскі кляштар, будынак Варварынскай царквы, езуіцкі касцёл, касцёл Святога Карла Барамея, Вялікую сінагогу, палац рымска-каталіцкага біскупа, руіны замка Вішнявецкіх і іншыя гістарычныя мясціны. Праводзіліся таксама экскурсіі па рацэ Піне, наваколлю Пінска.

IV Палескі кірмаш праводзіўся непасрэдна перад Другой сусветнай вайной і ў яе пачатку – 15 жніўня – 3 верасня 1939 г. Наогул, Палескія кірмашы былі накіраваны на эканамічнае аднаўленне Палесся, экспарт мясцовай сыравіны і прадукцыі, на папулярызацыю традыцыйнай культуры, мастацкіх рамёстваў і промыслаў, на развіццё турызму на Палессі.

Спецыфіка этнаканфесіянальнага складу насельніцтва прадвызначыла выразную прысутнасць у культурным жыцці Пінска грамадска-культурнай дзейнасці яўрэяў, рускіх, украінцаў. У жыцці прадстаўнічай яўрэйскай супольнасці важнае значэнне мелі каштоўнасці іўдаізму. Толькі ў Пінску налічвалася 29 яўрэйскіх бажніц, у мясцовым прадмесці Каралін – 17. У Пінску найперш вылучалася Вялікая сінагога, узведзеная ў XVII ст. (разбурана пасля Вялікай Айчыннай вайны), а таксама сінагога «Пінскер клойз» («Кляйнс»), якая размяшчалася каля Вялікай сінагогі[2].

У Пінску з 5 яўрэйскіх рэлігійных школ былі 2 талмуд-торы – 2-класная (пры ёй у 1930 г. былі адкрыты 3-класная рэлігійная школа «Бет-Якаў» і 4-класная для хлопцаў, а таксама школа «Тушыя») і 8-класная рэлігійная школа культурна-асветніцкага таварыства «Хорэў», якому падпарадкоўваліся ўсе талмудторы ў Польшчы[3]. Акрамя Пінска талмуд-тора дзейнічала ў Караліне. Поль-

[1] ДАБВ, ф. 2005, воп. 1, спр. 529, арк. 39, 47–48.

[2] Синагоги Пинска // Карлин. 2005. 16 ноября. С. 11.

[3] ДАБВ, ф. 59, воп. 2, спр. 703, арк. 3; спр. 623, арк. 1; спр. 652, арк. 2.

скую мову вывучалі ўжо з першага класа. Заняткі пачыналіся з чытання малітваў. Вельмі распаўсюджанай формай урокаў у пачатковых класах з'яўлялася гутарка настаўніка з вучнямі. Сярод шэрагу ешыботаў, найбольш вядомыя з якіх былі ў Валожыне і Міры, дзейнічала таксама іешыва ў Пінску, дзе было больш за 50 вучняў[1].

Матэрыяльна-тэхнічная база прыватных яўрэйскіх рэлігійных школ заставалася слабай, яны размяшчаліся пераважна ў непрыстасаваных для вучобы памяшканнях. Напрыклад, у Пінску 8-класная школа «Тушыя» для хлопцаў размяшчалася ў трох будынках на розных вуліцах[2]. Востра адчуваўся недахоп падручнікаў, вучэбных дапаможнікаў. У школе «Хорэў» у Пінску ў бібліятэцы налічвалася ўсяго 75 кніг на 120 вучняў[3]. Многія настаўнікі гэтых школ дрэнна ведалі польскую мову. У школах не выконваліся санітарна-гігіенічныя нормы.

Яўрэйскія абшчыны наладжвалі разнастайныя рэлігійныя курсы, мэтай якіх было паглыбленне ведаў па рэлігійных прадметах, іўдаіке, выхоўванне любові да нацыянальна-культурных каштоўнасцей. Курсы прызначаліся найперш для дзяцей, якія вучыліся ў дзяржаўных пачатковых школах. Заняткі на курсах працягваліся 5–6 гадзін у тыдзень па спецыяльнай праграме. Іх наведвалі хлопчыкі і дзяўчынкі 6–8-гадовага ўзросту. Былі і асобныя курсы для хлопцаў і дзяўчат. Так, у Пінску таварыства «Агудас-Ісраэль» адкрыла курсы для дзяўчат, дзе вывучалі іўрыт, Талмуд, літургію і гісторыю яўрэяў. Штодзённа (акрамя суботы, нядзелі і святаў) на працягу адной гадзіны заняткі праводзіла выпускніца кракаўскай семінарыі «Бет-Якаў» М. Дварэцкая[4].

На канферэнцыі Агульнай сіяністкай арганізацыі Палескага ваяводства, што адбылася 1–2 ліпеня 1929 г. у Пінску, сярод першачарговых задач называлася актывізацыя работы культурна-асветніцкага таварыства «Тарбут»[5]. У Пінску яго аддзел (кіраўнік А. Мазур) існаваў з 1926 г., аднак быў нешматлікі – налічваў звыш 40 чалавек. Сродкі рэгіянальнай адзінкі былі нязначныя, бо складаліся з абавязковых членскіх узносаў, прыбыткаў ад культурна-асветніцкіх мерапрыемстваў[6].

У адукацыйных установах «Тарбут» іўрыт з'яўляўся мовай выкладання ўсіх прадметаў, акрамя польскай мовы і гісторыі. Гімназія «Тарбут», што была заснавана ў Пінску ў 1922 г. яшчэ як 4-класная сярэдняя школа, а ў 1926 г. атрымала статус гімназіі, мела прыродазнаўча-матэматычны профіль, была даступна пераважна для маёмасных слаёў яўрэйскай супольнасці горада. У першы год у ёй навучаліся 425 чалавек[7]. У 1–4-м класах вучні вывучалі асновы іўрыта, яўрэйскую гісторыю, сусветную гісторыю, польскую і лацінскую мовы, арыфметыку, геаграфію, батаніку, асновы хіміі. У 5–7-м класах вывучалі сусветную, а потым і яўрэйскую літаратуру, у 8-м класе – філасофію, сацыялогію, псіха-

[1] Archiwum Akt Nowych w Warszawie. Zespół 9/1. Sygn. 1062. K. 18; Najnowsze dzieje żydów w Polsce: w zarysie (do 1950 roku). Warszawa, 1993. S. 249.

[2] ДАБВ, ф. 59, воп. 2, спр. 652, арк. 5, 8, 26.

[3] Тамсама, спр. 623, арк. 36 адв.

[4] Тамсама, спр. 763, арк. 6.

[5] Тамсама, ф. 1, воп. 9, спр. 442, арк. 4.

[6] Тамсама, спр. 1007, арк. 24 адв.

[7] Тамсама, ф. 59, воп. 2, спр. 1271, арк. 16; Sprawy narodowościowe. 1936. № 6. S. 646.

логію[1]. У 1927 г. у гімназіі «Тарбут» для большасці вучняў была зніжана плата за навучанне на 15–90%[2]. Пасля эміграцыі ў Палесціну яе дырэктара А. Мазура яго пасаду ў 1931 г. заняў аўтарытэтны, высокакваліфікаваны настаўнік Д. Альпер, «чалавек вялікіх ведаў і высокай культуры», які з 1923 г. працаваў у гімназіі інспектарам, а потым настаўнікам[3]. У 1936 г. у гімназіі «Тарбут» у Пінску налічвалася 2587 вучняў, у яе бібліятэцы было 4,5 тыс. кніг[4]. З 1937/38 навучальнага года пры гімназіі пачаў дзейнічаць гуманітарна-прыродазнаўчы ліцэй. Пінская гімназія «Тарбут» карысталася добрай рэпутацыяй сярод яўрэяў усёй Польшчы. З усіх гімназій «Тарбут» у Польшчы толькі сярэднія школы ў Пінску і Беластоку атрымалі правы публічнасці.

Яўрэйская 7-класная пачатковая школа «Мідраша-Тарбут» была створана ў 1925 г. Туды прымалі на вучобу з 7–8 гадоў. Школа размяшчалася ў сямі прыватных будынках. У верасні 1927 г. у школе налічвалася 226 вучняў, большасць якіх (88%) паходзіла з незаможных сацыяльных слаёў – рамеснікаў, рабочых, дробных гандляроў, інтэлігенцыі. Для 40% навучэнцаў была зніжана плата за вучобу. Дэфіцыт школьнага бюджэту быў вялікім: у 1925/26 навучальным годзе – 4,8 тыс. злотых, у 1926/27 навучальным годзе – 6,83 тыс. злотых. Аднак магістрат не задаволіў просьбы аб выдзяленні субсідый[5]. У школе «Мідраша-Тарбут» у 1934 г. навучалася 609 дзяцей. У 1936 г. бацькі дзяцей купілі для школы 360 кніг[6]. Сярод выкладчыкаў былі вопытныя і кваліфікаваныя спецыялісты, якія скончылі настаўніцкія семінарыі, гімназіі, курсы.

Народная школа імя М. Глейбермана была вельмі папулярнай сярод рабочых і кантралявалася Бундам. У Пінску дзейнічалі 2 пачатковыя школы ЦЯША: у 1927/28 навучальным годзе ў 7-класнай было 228 вучняў і 7 настаўнікаў, у 1-класнай – 31 вучань і 2 настаўнікі. Было таксама 5 яўрэйскіх прафесійных школ – сталярная і слясарная мужчынскія рамесніцка-прамысловыя школы Ю. Пекача, жаночая швейная школа «Цэнтрас», жаночая швейная школа Я. Гольцмана, камерцыйная школа А. Ашхера[7].

Выкарыстоўваючы пазіцыі ў гарадской радзе, яўрэйскія прадстаўнікі імкнуліся падтрымліваць уласныя нацыянальныя школы. Спачатку разавая дапамога для яўрэйскіх школ не перавышала 200–250 злотых. У ліпені 1929 г. для талмуд-торы, народнай школы імя М. Глейбермана, школы ЦЯША было выдзелена па 6 тыс. злотых, для школы «Тэль-Хай» – 3 тыс. злотых, пачатковай школы № 4 («шабасуўкі») – 10 тыс. злотых, «Мідраша-Тарбут» – 3 тыс. злотых[8]. У канцы 1930 г. магістрат выдзеліў яўрэйскім школам 2,5 тыс. злотага[9]. Такая шчодрая дапамога для яўрэйскіх сіяністцкіх адукацыйных установ

---

[1] *Gisenstejn M.* Jewish schools in Poland 1919–1939. New York, 1950. P. 44–46.

[2] ДАБВ, ф. 59, воп. 2, спр. 1097, арк. 19, 23.

[3] *Эліасберг Я.* Успаміны і сустрэчы // Спадчына. 1996. № 4. С. 205; *Sołomian-Łoc F.* Getto i gwiazdy. Warszawa, 1995. S. 47.

[4] *Gisenstejn M.* Jewish schools in Poland 1919–1939. P. 96; Biblioteki na wschodnich ziemiach II Rzeczypospolitej: informator. Poznań. 1998. S. 457.

[5] ДАБВ, ф. 2005, воп. 1, спр. 133, арк. 48, 51.

[6] Тамсама, ф. 310, воп. 3, спр. 139, арк. 58.

[7] Тамсама, ф. 59, воп. 3, спр. 316, арк. 3.

[8] Тамсама, ф. 2005, воп. 1, спр. 48, арк. 70 адв.

[9] Тамсама, спр. 55, арк. 39 адв.

выклікала ў гарадской радзе незадаволенасць бундаўцаў і прадстаўнікоў іншых левых сіл.

Да канца 1930-х гг. у горадзе налічвалася 8 яўрэйскіх друкарняў (сярод іх існаваўшыя яшчэ з дарэвалюцыйнага часу друкарні Вальковічаў, Б. Козела, Глаўберманаў, Ш. Валавельскага). Яўрэйская прэса распаўсюджвалася як праз кніжныя крамы, лаўкі, бібліятэкі, так і па падпісцы (разносчыкамі).

У Пінску выдаваліся такія газеты, як штодзённая «Pinsker Wort» («Пінскае слова», 1931–1938), «Pinsker Voch» («Пінскі тыдзень», 1932–1937), «Pinsker Sztime» («Пінскі голас», 1928–1939) і інш. У 1935 г. агульны тыраж пяці мясцовых яўрэйскіх газет дасягаў 3350 экзэмпляраў. На працягу 1920–1930-х гг. у Пінску выдавалася каля 20 яўрэйскіх перыядычных выданняў на ідыш і іўрыце[1]. Бібліятэка Таварыства падтрымкі яўрэйскай асветы і культуры ў Пінску ў 1936 г. налічвала 10 тыс. кніг.

Прысутнасць рускіх у структуры гарадскога насельніцтва была нязначнай – у 1931 г. іх налічвалася 2,9 тыс. чалавек (9%)[2]. З пачатку 1920-х гг. яны сталі праяўляць грамадска-палітычную і культурна-асветніцкую дзейнасць. Першая манархічная арганізацыя ў Пінску ўзнікла ў 1922 г. (яе арганізавалі прыехаўшыя з Берліна члены «Брацтва Рускай Праўды»), другая – у 1923 г. Летам 1924 г. яны ўвайшлі ў склад «Русского общевойскового союза». Пінскія манархісты былі ўцягнуты ў знакамітую чэкісцкую арганізацыю «Трэст»[3].

У 1920–1930-я гг. у Пінску дзейнічалі аддзелы Рускага народнага аб'яднання (РНА), Рускага дабрачыннага таварыства (РДТ), Рускай арганізацыі моладзі (РАМ). У 1927 г. у горадзе быў створаны аддзел РНА, які сканцэнтраваўся на грамадска-палітычнай працы[4]. Перыяд найбольшай актыўнасці гэтай арганізацыі прыпадае на час выбараў у прадстаўнічыя органы Польшчы ў 1928 г. Сярод выбарчых лозунгаў РНА ў 1928 г. былі патрабаванні аб адкрыцці рускіх школ і абавязковым вывучэнні рускай мовы ў польскіх школах, захаванні праваслаўных традыцый[5]. Арганізацыя змагла дабіцца пэўнага поспеху: менавіта ад Пінскай выбарчай акругі ў польскі сейм быў выбраны паслом П. Кароль з Брэста.

Пры аддзелах РДТ гуртавалася мясцовая руская інтэлігенцыя, стваралiся літаратурныя, тэатральныя гурткі, іншыя творчыя аб'яднанні. Аддзел РДТ у Пінску, які ўзнік у 1925 г., займаўся ўтрыманнем 7-класнай рэальнай гімназіі, падтрымкай рускіх эмігрантаў. На чале аддзела стаў інжынер М. Катовіч, яго намеснікам быў дырэктар Пінскай рускай рэальнай гімназіі А. Цыбрук. Сярод членаў праўлення былі В. Пятроўскі (уладальнік кінатэатра «Казіно»), служачыя магістрата У. Прытулецкі, К. Саўчук. Пасля пераезду М. Катовіча з Пінска ў Брэст старшынёй аддзела РДТ у Пінску стала памешчыца В. Смалянская[6].

---

[1] *Злобин Э.* От «Пинского листка» до «Пинского голоса» // Карлин. 2002. 21 декабря. С. 7.

[2] ДАБВ, ф. 1, воп. 9, спр. 1182, арк. 246.

[3] *Ильин А.* Петербургский и пинский архитектор Николай Котович // Гістарычная брама: гісторыя і культура Палесся. Пінск, 2009. № 1 (24). С. 98–100.

[4] ДАБВ, ф. 1, воп. 9, спр. 1182, арк. 275.

[5] Тамсама, воп. 10, спр. 909, арк. 34.

[6] Тамсама, ф. 114, воп. 1, спр. 1а, арк. 2.

Аддзел РДТ у Пінску пасля страты ў 1928 г. дазволу на ўтрыманне гімназіі праяўляў клопат пра бібліятэку і арганізоўваў розныя культурна-асветніцкія мерапрыемствы, даходы ад якіх ішлі на дабрачынныя мэты. У сярэдзіне 1931 г. у складзе Пінскага аддзела РДТ быў створаны гурток моладзі на чале з Д. Майковым, у рамках якога ўзніклі літаратурная, драматычная, музычная секцыі. Польскія ўлады выказвалі занепакоенасць ажыўленнем мясцовай рускай вучнёўскай і студэнцкай моладзі. Лідэрства сярод яе прыпісвалася інжынеру К. Пятроўскаму, «рускаму нацыяналісту», актывісту «Брацтва Рускай Праўды». У верасні 1931 г. група творчай моладзі (П. Хініч, Д. Майкоў, В. Каратышэўскі і інш.) пры падтрымцы Пінскай праваслаўнай кансісторыі выдала рускамоўную брашуру «Под небом Полесья», дзе былі змешчаны артыкулы аб рэвіндыкацыі праваслаўных святынь. У кастрычніку 1931 г. у Пінску пад рэдакцыяй П. Хініча выдаваўся аднайменны штотыднёвік. Па загаду пінскага старасты быў канфіскаваны ўвесь тыраж выдання, «органа рускіх нацыяналістаў, якія прапагандавалі ідэю 3-х плыняў рускага народа і змагаліся з нацыянальнай палітыкай ураду на Палессі». З-за ганенняў польскіх улад, фінансавых цяжкасцей у першай палове 1932 г. выданне перастала выходзіць. Намаганнямі рускай творчай моладзі Пінска 11 снежня 1932 г. быў выдадзены першы нумар тыднёвіка «Пинский голос»[1].

Аддзел РАМ у Пінску быў створаны лідэрамі мясцовай творчай моладзі Д. Майковым і В. Каратышэўскім. Яны былі ініцыятарамі і актыўнымі ўдзельнікамі рускага паэтычнага гуртка «Шалаш паэтаў», сябры якого пастаянна друкавалі свае творы ў рускамоўных выданнях Польшчы. Вершы Д. Майкова ўвайшлі ў выдадзеную ў 1937 г. «Анталогію рускай паэзіі ў Польшчы». У 1931 г. Д. Майкоў і В. Каратышэўскі паспрабавалі нават стварыць у горадзе прафесійны рускі тэатр з мэтай папулярызацыі рускай культуры сярод насельніцтва рэгіёна, але мясцовыя ўлады не дазволілі гэтага зрабіць[2]. Дзеячы РАМ прымалі актыўны ўдзел у правядзенні ўсіх значных культурных акцый рускай супольнасці, наладжвалі лекцыі, курсы, канцэрты, тэатральныя прадстаўленні, стваралі харавыя калектывы, гурткі, аказвалі маральную і матэрыяльную падтрымку вучням рускіх школ, студэнтам. З пачатку 1935 г. з боку польскіх улад былі прыняты меры па згортванні іх «шавіністычнай» публічнай дзейнасці. Пінскі аддзел РАМ быў вымушаны абмежаваць сваю працу дабрачыннасцю, а ў маі 1938 г. страціў права на існаванне.

Рускае рэальнае вучылішча (гімназія) у Пінску было адкрыта ў 1921 г. і на працягу ўсяго перыяду свайго існавання знаходзілася пад апекай праваслаўнага святара У. Сарашкевіча, а таксама аддзела РДТ. Першым яго дырэктарам быў Д. Георгіеўскі, які потым стаў захавальнікам Палескага музея. Пазней дырэктарам стаў А. Фёдараў. Школа атрымлівала матэрыяльную дапамогу ад мясцовай рускай інтэлігенцыі, служачых, памешчыкаў. Гэтая навучальная ўстанова карысталася вялікай папулярнасцю сярод жыхароў горада і наваколля: тут была ўмераная плата за навучанне, выкладаліся прадметы матэматычна-тэхнічнага профілю, вялося добра наладжанае культурна-эстэтычнае выхаванне. У 1928 г. вучылішча было закрыта быццам за актыўнае правядзенне «русіфікатарскай палітыкі». Паводле ацэнак польскіх уладаў, гімназія «пры-

[1] ДАБВ, ф. 1, воп. 10, спр. 909, арк. 37 адв., 38, 39, 44.

[2] Тамсама, ф. 2001, воп. 4, спр. 2857, арк. 34.

вівала вучням нянавісць да Польшчы», з'яўлялася «ачагом рускага шавінізму», дзе вучням загадвалі чытаць творы П. Краснова, К. Брэшка-Брэшкоўскай, гераізавалі Б. Каверду, які зрабіў 7 чэрвеня 1927 г. у Варшаве замах на савецкага пасла П. Войкава[1].

Акрамя бібліятэкі аддзела РДТ у Пінску дзейнічала з 1926 г. прыватная бібліятэка-чытальня М. Ключановіча, якая з'яўлялася цэнтрам асветніцкага, мастацкага, літаратурнага жыцця мясцовай рускай супольнасці горада. У 1929 г. яе фонды складалі 2,5 тыс. экзэмпляраў[2]. Там пастаянна працавала чытальня, дзе меліся рускія газеты, што выходзілі ў Польшчы і за мяжой. У бібліятэцы наладжвалі літаратурныя салоны, чыталі рускую эміграцкую літаратуру, творы мясцовых аўтараў, праводзілі дыспуты. Акрамя гаспадара ўдзельнікамі былі Д. Майкоў, В. Каратышэўскі, мастак А. Заяц, які прыязджаў з Парыжа, студэнты П. Бурчанка, П. Шчэрбачэвіч, якія вучыліся ў Празе, іншыя дзеячы[3]. У памяшканні бібліятэкі М. Ключановіча размяшчалася рэдакцыя «Пинского голоса». Паколькі М. Ключановіч быў пазбаўлены за палітычную дзейнасць польскага грамадзянства і вымушаны ў 1933 г. выехаць у СССР, бібліятэкай стаў загадваць В. Каратышэўскі.

У 1920–1930-я гг. актывізавала грамадска-культурную дзейнасць на тэрыторыі Палескага ваяводства і ўкраінская супольнасць. Як адзначана ў адной са справаздач IX Корпуса аховы памежжа ў 1923 г., дзеячы таварыства «Просвіта» аб'ядноўваліся пад выглядам кааператываў, выступалі за незалежную Украіну. «Гэты рух больш небяспечны за бальшавізм, бо яго кіраўнікі з'яўляюцца людзьмі інтэлігентнымі, пераважна з вышэйшай адукацыяй. ...Арганізацыя наогул вельмі актыўная, паспяхова развівае агітацыю ў вёсках. У гэтым асабліва вылучаюцца папы (святчэннаслужыцелі) і настаўнікі ўкраінскага паходжання. Чым далей на поўдзень, тым мацнейшая дзейнасць «Просвіты». На гэтых тэрыторыях агітатары паводзяць сябе вельмі варожа, проста абуральна, яскрава настройваюць насельніцтва супраць Польшчы. Акрамя Брэста, апорнымі пунктамі «Просвіты» з'яўляюцца Пінск, Лунінец, Сарны...»[4]

З-за незаможнасці сялянскага ўкраінскага насельніцтва таварыства «Просвіта» адчувала востры недахоп фінансавых сродкаў для ўтрымання ўкраінскай сярэдняй школы ў Брэсце, будаўніцтва там народнага дома. Мясцовая арганізацыя «Просвіты» пазбавілася ўласнага памяшкання – Палеская праваслаўная кансісторыя выселіла яе з брацкага дома.

Пэўную падтрымку арганізацыя атрымлівала ад украінскіх паслоў, цэнтральнай рады «Просвіты» ў Львове, заходнеўкраінскіх партый. Матэрыяльную дапамогу аказвалі і з усходу. Так, у прадстаўленым для абмеркавання на пасяджэнні Бюро ЦК КП(б)У праекце каштарысу выдаткаў на ўкраінскую працу за мяжой (дакумент датуецца 6 студзеня 1927 г.) сярод іншых пазначаны сродкі на ўтрыманне сярэдніх школ у Брэсце і Пінску (па 400 руб. аднаразова), стварэнне там жа сярэдніх школ (па 3 тыс. руб.), узвядзенне народнага дома

[1] ДАБВ, ф. 1, воп. 10, спр. 909, арк. 43.

[2] Тамсама, воп. 9, спр. 1182, арк. 74; Biblioteki na wschodnich ziemiach II Rzeczypospolitej: informator. Poznań. 1998. S. 456.

[3] ДАБВ, ф. 1, воп. 10, спр. 909, арк. 47 адв.

[4] Тамсама, ф. 67, воп. 1, спр. 17, арк. 25.

ў Брэсце (4 тыс. руб.), арганізацыю структурных адзінак «Просвіты» ў Кобрыне і Пінску (па 200 руб.)[1].

У 1930-я гг. заходнеўкраінскія культурна-асветніцкія арганізацыі ажыццяўлялі мэтанакіраваную працу па ўкраінізацыі мясцовага насельніцтва Палесся. Украінскі пасол І. Завалыкут пасля кансультацый у Брэсце з мясцовымі ўкраінскімі актывістамі адносна ажыўлення дзейнасці «Просвіты» сярод шэрагу гарадоў Палескага ваяводства наведаў і Пінск[2]. Было прапанавана наладзіць праз «Просвіту» экскурсіі ўкраінскай моладзі ў Галіцыю.

Такім чынам, сацыяльна-эканамічнае становішча і духоўна-культурнае жыццё Пінска ў разгледжаны перыяд вызначалася не толькі разнастайнасцю, але і складанасцямі, якія былі характэрны для ўсёй Заходняй Беларусі ў час яе знаходжання ў складзе Польшчы.

---

[1] *Винниченко І.* Українці Берестейщини, Підляшшя й Холмщини в першій половині XX століття: хроніка подій. Київ, 1997. С. 269–270.

[2] ДАБВ, ф. 1, воп. 10, спр. 1518, арк. 35–35 адв.